КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №4 (180)
◂ 5 ЛЮТАГА ◂ 2010 г.

# Новы Час



## АНДРЭЙ КУДЗІНЕНКА

Стар. 6

**ЛІБЕРАЛЬНАСЦЬ МАЛЫМІ ДОЗАМІ**

«Дабрыня» Цэнтрвыбаркама будзе не бязмежнай, а дазаванай і бяспечнай для адладжанай за гады сістэмы выбараў

Стар. 4

**ШЫРОКАЯ АЎТАНОМІЯ? ДЗЯКУЙ, НЕ ТРЭБА**

Пра дзівосныя завіхрэнні французскага посткаланіялізму журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з французскім калегай Бярнардам Шмідтам, які нядаўна пабываў на Марцініцы

Стар. 13

**ПАСЕЧАНАЯ ДЫНАСТЫЯ**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## ЦАНА ІМПЕРСКАГА СІНДРОМУ

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

АД РЭДАКТАРА

# УДАЎКА ДЛЯ БАЙНЭТУ

Аляксей КАРОЛЬ

**Калі прачытаў указ аб рэгуляванні карыстання інтэрнэтам, успомніўся адзін эпізод са старой замежнай кінакамедыі «Містэр Піткін у тыле ворага».**



Плакат. «1937». Руслан Найдзен, Аляксандар Наважылаў, 1990

На медкамісіі ўрач, прыставіўшы фанендаскоп да грудзей Піткіна, камандуе: «Удых… Выдых… Удых… Выдых… Выдых… Выдых…» І той, бедалага, паступова асядае, губляючы прытомнасць.

Успомнілася і нядаўняя размова з заходнім калегам па матывах дыскусіі па праекту ўказа аб рэгуляванні інтэрнэта, які напрыканцы мінулага года трапіў у незалежныя СМІ. Калега выказаў меркаванне, што беларускія ўлады ўстрымаюцца ад увядзення абмежаванняў і жорсткага кантролю над інтэрнэтам. Па той, найперш, прычыне, што гэта акцыя выкліча гучную і адмоўную рэакцыю Захаду, для якога інтэрнэт з'яўляецца паўсядзённым элементам жыцця, своеасаблівым сімвалам свабоды інфармацыі.

Калега памыліўся: указ стаўся фактам. Найперш, ён скіраваны на блакаванне апазіцыйных рэсурсаў, што асабліва актуальна падчас правядзення выбараў. З'явіўся спецыяльны орган кантролю за працай байнэту — Аператыўна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі прэзідэнта (ААЦ). «Падводныя камяні ўказа, — па меркаванні эксперта ў галіне інтэрнэт-журналістыкі Аляксандра Класкоўскага, — цьмяныя пункты аб рэгістрацыі сетак і інфармацыйных рэсурсаў… Шмат што аддадзена на дапрацоўку Савета міністраў. Тут вялікая прастора для «чыноўніцкай творчасці». І ніякай тайны перапіскі: пастаўшчыкі інтэрнэт-паслуг павінны будуць ажыццяўляць ідэнтыфікацыю абаненцкіх прылад карыстальнікаў інтэрнэт-паслуг, весці ўлік і захоўваць звесткі аб такіх прыладах і аказаных інтэрнэт-паслугах.

Усё ў поўнай адпаведнасці з унутранай логікай функцыянавання аўтарытарных рэжымаў: запалохаць, паралізаваць волю, унушыць адчуванне непахіснасці сістэмы і бессэнсоўнасці супраціву. Пры дапамозе апрабаваных за стагоддзі сродкаў: ад папярэджванняў і пагроз да сумы і турмы, ад выгнання да фізічнай ліквідацыі. Па закону і без. Імем інквізіцыі ці рэвалюцыі, ці «тысячагадовага рэйху», ці дыктатара бананавай рэспублікі… Попел ад вогнішчаў са «шкодных» кніг грукае нам у сэрца.

«Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся». Палічым за добрае хаця б тое, што нам выпала жыць унутры рэжыму адносна мяккай жорсткасці.

Бо ўлады маглі абысціся і без прыняцця закона ці ўказа, які ў нас вышэй закона. Але ж не тое стагоддзе на двары. І не на ўскрайку свету, а ў цэнтры Еўропы. Дый замежныя крэдыты з інвестыцыямі ой як патрэбныя.

Жыццё — не кіно. І барацьба з вольным словам у таталітарных і аўтарытарных краінах — справа сур'ёзная. Выдых, выдых, выдых… Спецаперацыя па ўкароту байнэту заняла год без тыдня. Першапачаткова гэта місія адводзілася новаму закону аб СМІ, прынятаму 8 лютага мінулага года. Але тут здарыўся «дыялог» з Захадам. Давялося крыху адкручваць назад.

Указ №60 «Аб мерах па ўдасканальванні выкарыстання нацыянальнага сегмента глабальнай кампутарнай сеткі Інтэрнэт» падпісаны 1 лютага гэтага года. Хваля крытыкі з боку айчыннай і міжнароднай дэмакратычнай грамадскасці і тут прымусіла крыху адступіць ад першапачатковага праекту, аднак ні крокам за межы агульнай палітыкі ў адносінах да свабоды слова, свабоды СМІ.

У адрозненні ад савецкай практыкі, беларускі рэжым вымушана дазваляе існаванне сегмента незалежных СМІ, але ў жорстка абмежаваных памерах, каб не дапусціць накаплення вольнага слова да крытычнай масы. Да таго ж старэйшае пакаленне «вертыкальшчыкаў» мае сваю памяць аб галоснасці, якая сталася адным з рашаючых чыннікаў краху савецкага рэжыму. І сваю памяць аб уласным прарыве да ўлады ў 1994 годзе, які наўрад ці стаўся б магчымым без свабоды СМІ.

Ды і як гэта чальцам касты недатыкальных для крытыкі трываць тое, што чытаюць пра сябе ў інтэрнэце. І не мець магчымасці заткнуць рот за «абразу гонару і годнасці», як гэта не раз рабілі з папяровымі СМІ. Хаміць публічна ў нас дазволена толькі зверху ўніз — па лесвіцы ўладнай вертыкалі. Я начальнік, ты — дурань.

Пакуль інтэрнэт быў забавай для меншасці, ён мала хваляваў улады, але калі сёння, па ацэнках кампаніі *Gemius*, у Беларусі налічваецца звыш трох мільёнаў карыстальнікаў, з якіх да 40 працэнтаў ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў, ён стаў успрымацца як непасрэдная пагроза.

Тым больш, што менавіта інтэрнэт з'яўляецца той прасторай, у якой дэмакратычная апазіцыя здолела спрацаваць на апераджэнне, адрадзіць у новай якасці зачыненыя ўладамі газеты, стварыць новыя рэсурсы, прывабіць шырокую аўдыторыю. Стварыць перавагу. Ні адзін з афіцыйных сайтаў нават блізка не стаіць з апазіцыйнымі па колькасці наведвальнікаў. І не зможа стаць, бо прапаганда — вораг якаснага зместу ў любым фармаце — навін, аналітыкі, нарысаў, эсэ, блогаў, мультымедыйнага прадукту.

Хаця прапановы супрацьстаяць свабоднаму інтэрнэту праз узмацненне сваіх інтэрнэтрэсурсаў з боку ўладных асоб гучалі. Але аўтарытарны ген прадыктаваў звярнуцца да апрабаваных сродкаў — забараніць і пакараць.

І ўзняць ва ўхвалу ўказу новую прапагандысцкую хвалю. Ужо 2 лютага афіцыйныя СМІ вылілі першую бочку мёду: якія цудоўныя і своечасовыя меры прадугледжвае ўказ па ачышчэнні інтэрнэту ад бруду парнаграфіі, жорсткасці, паклёпаў… Зразумела, дзеля бяспекі грамадзян, іх псіхічнага камфорту, іх добрага настрою.

Але ці ўлічыў аўтары гэтай хвалі, што беларуская прапаганда ўжо наблізілася да стану савецкай, якая, па сведчанню знакамітага пісьменніка, дысідэнта Сяргея Даўлатава, успрымалася з дакладнасцю наадварот: калі нешта бэсцілі, усе разумелі — гэта добрае, калі хвалілі, разумелі — дрэннае. Ды і карыстальнікі інтэрнэту — катэгорыя людзей дасведчаных. Так што будзем чакаць павялічэння колькасці наведвальнікаў дэмакратычнага байнэту.

Спроба накінуць удаўку на інтэрнэт у адной асобна ўзятай зоне глабальнага інтэрнэту — на байнэт, безумоўна, завершыцца правалам. Як гэта здарылася са спробай пабудаваць сацыялізм у адной асобна ўзятай краіне. Хаця турбот і непрыемнасцей дадасць.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЛЕЙКА. СЫШОЎ ПАНЯВОЛІ

Настаўнік Сяргей Клімёнак прыняў рашэнне пакінуць шэрагі Аб'яднанай грамадзянскай партыі ў выніку ціску з боку кіраўніка Упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама. Сяргей упэўнены, што нават пасля выхаду з АГП гісторыя не скончыцца, у спакоі яго наўрад ці пакінуць, тым больш, што ён пойдзе на выбары ў якасці кандыдата ў дэпутаты, але ўжо як беспартыйны, ад працоўнага калектыву. Ён здзейсніў гэты крок свядома, бо кіраўнік Упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама Таіса Данілевіч пагражала ў выпадку непадпарадкавання вялікімі праблемамі ўсяму педкалектыву, у якім працуе Сяргей.

### ВІЦЕБСК. ВЫНІКОВАЯ ВЫСТАВА

Адкрылася выніковая выстава летняга пленэру, прысвечанага Яну Баршчэўскаму, які быў адным з пачынальнікаў беларускай літаратуры. Мэта пленэру і выставы — прыцягнуць увагу да асобы і творчасці слаўнага сына Бацькаўшчыны, які падараваў нашаму народу свой бессмяротны твор «Шляхціч Завальня». Працы, прадстаўленыя на выставе, сведчаць, што мастакі змаглі данесці чароўныя вобразы славутага твора, паказаць прыгажосць родных мясцін пісьменніка, стварыць яго партрэты. На пленэры разам з вядомымі ў краіне мастакамі працавала моладзь. На выставе творчасць маладых радуе вока. Асабліва ўдалыя творы ў Змітра Буглака, Вадзіма Богдана, Міхася Мішука. Выдзяляецца сваім майстэрствам графіка Крысціны Аушавай, выхаванкі мінскай гімназіі-каледжа мастацтваў імя Ахрэмчыка. Прыцягваюць да сябе таленавітыя фотаэцюды Марыны Бацюковай. Цікавыя працы прадставілі і вядомыя мастакі Алег Скавародка, Алесь Марачкін, Міхась Цыбульскі, Святлана Баранкоўская, Чэслаў Шамшур, Юрась Платонаў, Яўген Шатохін, Валеры Шчасны. Пасля Віцебску выстава наведае шмат іншых гарадоў Беларусі.

### КОСАВА. АДЗНАЧЫЛІ ЎГОДКІ НАРАДЖЭННЯ

Ва ўрочышчы Марачоўшчына (Івацэвіцкі раён) у сядзібе-музеі Тадэвуша Касцюшкі прайшлі ўрачыстасці з нагоды 264-х угодкаў нараджэння славутага земляка, змагара за свабоду, вядомага не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце.

Традыцыйна ў мерапрыемстве прынялі ўдзел дыпламаты амбасадаў тых краінаў, якія таксама ўшаноўваюць памяць Тадэвуша Касцюшкі. Ва ўрачыстасцях удзельнічалі жыхары Берасцейшчыны, прадстаўнікі ўладаў і дэмакратычнай грамадскасці.

### ВІЛЕЙКА. АДБЫЛАСЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Прайшла прэзентацыя кніжак, выдадзеных аўтарамі з Вілейскай літаратурнай суполкі «Натхненне». Імпрэза адбылася ў Зале выставаў. На сустрэчы з аўтарамі прысутнічалі як мясцовыя, так і госці з Маладзечна, што прадстаўлялі творчую суполку «Агмень». Да сорам гаспадароў, атрымалася так, што гасцей з суседняга райцэнтра завітала больш за мясцовых аматараў прыгожага слова і, па-сутнасці, прэзентацыя прайшла для «агменцаў». На сустрэчу завітаў знакаміты руплівец на ніве беларушчыны Міхась Казлоўскі, укладальнік шматлікіх краязнаўчых зборнікаў і галоўны рэдактар часопіса «Куфэрак Віленшчыны».

### МІЁРЫ. СЕЗОН АХОВЫ ПОМНІКАЎ

30 студзеня Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры распачала новы сезон рэгіянальных мерапрыемстваў 2010 года ў межах агульнанацыянальнай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі». У гэты раз акцыю распачалі старшыня Рэспубліканскага савета БДТАПГК Антон Астаповіч, адзін з самых актыўных сяброў Таварыства Зміцер Яцкевіча і выконваючы абавязкі намесніка старшыні Мінскага абласнога аддзялення аб'яднання і пры гэтым каардынатара кампаніі «Будзьма» Ігар Ляльков. Мерапрыемства пры падтрымцы райвыканкама і пры ўдзеле прадстаўнікоў раённай выканаўчай улады прайшло ў сярэдняй школе № 3. А непасрэдным арганізатарам круглага стала, у ходзе якога былі плённа абмеркаваны пытанні краязнаўчага вывучэння Міёраў і ваколіц ды інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай спадчыны ва ўстойлівым развіцці рэгіёна, з'явіўся настаўнік гісторыі дадзенай школы, вядомы рэгіянальны краязнаўца і энтузіяст-даследчык Вітальд Ермалёнак.

▸ РАДА

## АДЗІНЫ КАНДЫДАТ ПЕРАМОЖА

**На прэзідэнцкіх выбарах шансы перамагчы заўсёды ёсць у тых, хто змагаецца за сваю краіну і інтарэсы народа, будуе свае дзеянні на прынцыпах маралі і прыстойнасці, а не на хлусні, крывадушнасці і цынізме.**

Пра гэта заявіў палітык Аляксандр Казулін 2 лютага ў Мінску на пасяджэнні грамадскай ініцыятывы «Рада беларускай інтэлігенцыі».

Паводле яго слоў, надышоў час, калі трэба ўсё і ўсіх назваць сваімі імёнамі, і найперш у апазіцыйным асяроддзі. «Неабходны жорсткі, ясны, праўдзівы, аб'ектыўны і канкрэтны аналіз сітуацыі. І хопіць быць добранькімі з усімі, калі Радзіма ў небяспецы», — сказаў Казулін.

Паводле меркавання старшыні рады, педагога і кінарэжысёра Уладзіміра Коласа, калі на прэзідэнцкіх выбарах дэмакратычныя сілы аб'ядноўцца вакол найбольш перспектыўнага кандыдата, то паводле вынікаў экзіт-полаў ён зможа набраць больш за палову галасоў выбаршчыкаў. Колас перакананы, што галоўным з'яўляецца здольнасць і рашучасць народа і яго лідэраў абараніць свой выбар.

Як лічыць Уладзімір Колас, найбольш перспектыўны кандыдат павінен быць вызначаны ў выніку пагаднення лідэраў дэмакратычных сіл і руху. Пры гэтым інтэлігенцыя павінна выкарыстоўваць свой аўтарытэт падчас кансультацый з лідэрамі дэмсіл, дадаў акадэмік Аляксандр Вайтовіч.

Першы пасол Беларусі ў Германіі, дэпутат Вярхоўнага савета XI склікання, кандыдат філалагічных навук Пётр Садоўскі мяркуе, што рада павінна звярнуць увагу грамадства на амаральнасць цяперашняй сітуацыі і прыярытэт маральных каштоўнасцяў, а паэт Сяргей Законнікаў прапанаваў ініцыяваць агульнанацыянальную дыскусію па актуальных праблемах жыцця грамадства ў дэмакратычных друкаваных і электронных СМІ.

Удзельнікі пасяджэння вызначылі графік кансультацый з лідэрамі дэмакратычных партый і руху.

**Паводле БелаПАН**

▸ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

## ТАЦЦЯНА ШАПУЦЬКА Ў ЕГУ

**Таццяну Шапуцьку, адлічаную з юрфаку БДУ, 2 лютага прынялі на другі курс Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Вільні па спецыяльнасці «паліталогія».**



Сумоўе ўзначальваў асабіста рэктар ЕГУ прафесар Анатоль Міхайлаў. «У мяне было дзве сустрэчы. Першая — са спадаром Міхайлавым, які распытваў пра сістэму адукацыі ў Беларусі, пра маё бачанне далейшага развіцця дэмакратычнага руху і беларускіх навучальных установаў. Другая сустрэча была з дэканам дэпартамента паліталагічных навук і з усімі прарэктарамі. Да маёй нечаканасці, гэтая сустрэча праходзіла цалкам па-англійску, бо адна з прарэктарак, адказная за міжнародныя сувязі, была амерыканкай. Мне задавалі розныя пытанні — ад таго, што я праходзіла ва універсітэце да тэхнічных момантаў — у прыватнасці, ці маю я доступ да інтэрнэту. Урэшце мне сказалі, што я прынятая на вучобу. Літаральна праз два тыдні ва універсітэце пачынаецца сесія, на якой я павінна прысутнічаць», — распавяла Таццяна.

Нагадаем, Таццяну Шапуцьку, намесніцу старшыні Маладога Фронту, адлічылі з юрфака БДУ ў пачатку снежня пасля яе ўдзелу ў Форуме грамадзянскай супольнасці «Усходняга Партнёрства» ў Брусэлі. Фармальна — за тое, што парушыла правілы, не папрасіла дазволу на выезд за мяжу.

Таццяна падала скаргу спачатку рэктару БДУ Сяргею Абламейку, затым міністру адукацыі Аляксандру Радзькову. Абодва адказалі аднолькава: загад пра выключэнне не будзе скасаваны, усе зроблена законна. Зараз Таццяна рыхтуе скаргу ў суд на Белдзяржуніверсітэт, бо пратэстуе супраць адлічэння. Варта адзначыць, што дзяўчына вучылася вельмі добра (сярэдні бал 8,5), і апроч трох дзён удзелу ў Форуме іншых пропускаў не мела.

**Паводле «Еўрарадыё»**

▸ ЦІКАВА

## ЗЯЛЁНЫЯ ІДУЦЬ У ПАЛІТЫКУ

**Беларуская партыя «Зялёныя» (БПЗ) фарміруе адкрыты спіс кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў.**



Паводле слоў лідэра партыі Алега Новікава, любы незалежны кандыдат, які падзяляе прынцыпы БПЗ, можа далучыцца да блоку.

Новікаў адзначыў, што арганізавана партыя не ўдзельнічала ў выбарах ужо больш за 20 гадоў. «Былі спробы самастойнага вылучэння сяброў партыі, але арганізавана партыя сваіх кандыдатаў не вылучала. Цяпер мы вырашылі вярнуцца ў актыўную палітыку», — сказаў ён.

Паводле слоў лідэра БПЗ, партыя разглядае выбары ў мясцовыя саветы "як магчымасць для прыцягнення ўвагі ўладаў і грамадскасці да праблем экалогіі ў нашай краіне».

«Стаўшы дэпутатамі мясцовых саветаў, нашы актывісты будуць садзейнічаць рэалізацыі асноўных кірункаў дзейнасці партыі. Гэта распрацоўка комплексу экалагічных законаў, выкарыстанне ва ўсіх галінах толькі экалагічна чыстых, энергазберагальных і бяспечных тэхналогій, а таксама забеспячэнне грамадзянам Беларусі права на здароўе і паўнацэннае жыццё ў сацыяльна і экалагічна здаровым асяроддзі», — патлумачыў Алег Новікаў.

▸ КОНКУРС

## БЕЛАРУСАЎ ЗАПРАШАЮЦЬ У БЕРЛІН

**Берлінскае таварыства «Нямецка-рускі абмен» праводзіць конкурс на атрыманне стыпендый валанцёраў для працы на працягу паўгода ў грамадскай арганізацыі.**

Беларусы, якім больш за 18 гадоў, якія валодаюць нямецкай мовай і бяруць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, могуць накіроўваць заяўкі на працу ў той сферы, якая іх цікавіць.

Стыпендыя ўключае консульскі збор за візу, выдаткі на дарогу, пражыванне ў Берліне і праязны білет. Акрамя таго, прадугледжаны 300 еўра штомесяц на кішэнныя расходы, а таксама праграма знаёмства з культурай і гісторыяй Германіі.

Валанцёр працуе 30–35 гадзін на тыдзень.

Апошні тэрмін падачы дакументаў — 28 лютага. Падрабязнасці на сайце http://www.austausch.org/freiwilligenagentur/deutschland/aktuelle-ausschreibung.html

▸ ВЫБАРЫ

## НЕ Ў ДЭПУТАТЫ, А Ў БОТЫ

*Алесь ЗАРЭМБЮК*

**Актывіста Руху «За Свабоду» з Мастоў Алега Пронскага 26 студзеня прымусова даставілі ў ваенкамат і ўручылі позву для адпраўкі ў войска раніцай 28 студзеня.**

Праўда, спалохаўшыся заявы ў суд на прадстаўнікоў ваенкамата, позву перапісалі на 1 лютага. Пронскі быў выкліканы ў ваенкамат акурат пасля таго, як яго кандыдатура была вылучана ў склад Гродзенскай абласной выбарчай камісіі. Ён працаваў брыгадзірам СВК імя Адама Міцкевіча. «Мой прызыў абумоўлены выключна палітычнымі прычынамі. Звычайна працаўнікам сельскай гаспадаркі даюць адтэрміноўку ад службы, але ж я збіраўся вылучыцца кандыдатам у дэпутаты Гродзенскага абласнога і Мастоўскага раённага саветаў дэпутатаў. Таму сітуацыя так і склалася. Мне проста замінаюць стаць дэпутатам. Незалежныя дэпутаты непатрэбныя ў мясцовых саветах», — тлумачыць Алег.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД



# ФІНАНСЫ ПЯЮЦЬ РАМАНСЫ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**«Беларускі эканамічны цуд» атрымаў чарговы ўдар пад дых. Беларусь пакуль не можа атрымаць ад Еўрасаюза фінансавую дапамогу ў памеры 290 мільёнаў долараў. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе Міжнароднага валютнага фонду, які апублікаваны па выніках трэцяга агляду выканання беларускім урадам праграмы stand-by.**

Першапачаткова чакалася, што Беларусь атрымае гэтыя сродкі яшчэ ў чацвёртым квартале 2009 года. У дакладзе МВФ адзначаецца, што затрымка з выдзяленнем сродкаў выклікана судовым рашэннем у ЕС, згодна з якім усе просьбы аб макрафінансаванні павінны разглядацца новай, а не адыходзячай Еўракамісіяй (чакаецца, што яе склад будзе зацверджаны 9 лютага). Гэта, у сваю чаргу, затрымае разгляд камісіяй пытання аб выдзяленні макрафінансавай дапамогі. Затым крэдыт павінен быць абмеркаваны і зацверджаны Еўрапарламентам.

«Існуе пэўная рызыка таго, што выдзяленне гэтай сумы не адбудзецца ў перыяд дзеяння праграмы (супрацоўніцтва Беларусі і МВФ па праграме stand-by разлічана да канца сакавіка 2010 года), а ў такім выпадку яно будзе залежаць ад наяўнасці новага механізму МВФ або дастатковых гарантый заключэння дамоўленасці пра такі механізм», — гаворыцца ў дакладзе.

А гэтыя грошыкі былі б нам вельмі дарэчы. Бо яшчэ 27 студзеня кіраўнік Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч заявіў, што новыя ўмовы паставак расійскай нафты ў Беларусь пацягнуць дадатковыя валютныя расходы, што ставіць задачу дадатковага прыцягнення знешніх рэсурсаў, у тым ліку МВФ.

Тым часам, здаецца, гэта праблема мала хвалюе кіраўніцтва Беларусі. Аляксандр Лукашэнка 3 лютага адправіўся з рабочым візітам у Швейцарыю, паведаміла прэс-служба прэзідэнта.

Згодна паведамленню, кіраўнік дзяржавы сустрэнецца з прадстаўнікамі бізнесу і палітычных колаў гэтай краіны. Дзелавая частка візіту, які будзе доўжыцца некалькі найбліжэйшых дзён, сумешчана з кароткатэрміновым адпачынкам.

То бок, Лукашэнка з'ехаў у Альпы пакатацца на лыжах. Гэта ён робіць амаль кожную зіму. Толькі вось чаму ён з'ехаў у Швейцарыю, а не ў Сілічы? Здаецца, і ў Беларусі зіма цудоўная, і снегу столькі, што камунальнічкі ўжо стаміліся яго вывозіць, і Сілічы былі б больш патрыятычным варыянтам. Але, здаецца, песня пра тое, што «не патрэбны нам бераг турэцкі», — не пра Аляксандра Лукашэнку.

У гэтай сітуацыі Беларусь, здаецца, усё ж вырашыла прадаваць «фамільнае срэбра». Беларусь зацікаўлена ў прыватызацыі комплексу «Нафтан-Палімір». Пра гэта заявіў 3 лютага журналістам у Гомелі прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі.

«Мы ў цэлым зацікаўлены ў тым, каб «Нафтан-Палімір» разглядаўся як комплекс, які мог бы працаваць сёння ва ўмовах прыватызацыі», — зазначыў Сідорскі. «Мы і Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, і «Нафтан» з «Паліміram», і іншыя прадпрыемствы нафтахімічнага комплексу, у тым ліку і «Азот», і «Магілёўхімвалакно», у пагадненні, якое мы распрацоўваем па супрацоўніцтве ў паліўна-энергетычнай сферы, прапісалі. Мы з нашымі расійскімі калегамі прымаем усе меры, каб сумесную стратэгію дзвюх краін у паліўна-энергетычнай сферы зацвердзіць і прадставіць яе на разгляд Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы», — сказаў прэм'ер.

Больш за тое, Сідорскі паведаміў, што Беларусь плануе падпісаць з Расіяй пакет дакументаў па будаўніцтве АЭС не пазней за чэрвень 2010 года. «Расійскі бок прапанаваў Беларусі падпісаць дакументы, якія тычацца будаўніцтва АЭС і крэдыту пад праект, у пакеце. Тэрмін, які мы вызначылі, — не пазней за чэрвень гэтага года», — сказаў кіраўнік беларускага ўрада.

«Пакуль рабочыя групы актыўна працуюць над гэтым пытаннем. Думаю, што мы выйдзем на падпісанне пакетнага пагаднення, якое будзе задавальняць і беларускі, і расійскі бок», — падкрэсліў Сідорскі. Паводле яго слоў, Беларусь пачынае будаўніцтва сацыяльнай інфраструктуры пад будучую АЭС. «Цяпер, з 2010 года, мы павінны правесці работу па стварэнні вытворчай інфраструктуры і вырашыць пытанне па будаўніцтве станцыі і па крэдыце», — зазначыў кіраўнік урада.

Пытанне адно і тое ж: за якія грошыкі? Не атрымалі крэдыт ад МВФ — атрымаем у Расіі? Ці грошы ад прыватызацыі «Нафтан-Паліміра» пойдуць на будаўніцтва АЭС? Увогуле, падчас крызісу замуціць праект па будаўніцтве АЭС, калі дзяржава і так у вялікіх пазыках, — ці гэта слушна?

І добрай навіной стала тое, што Беларусь прарвалася на прэмію «Оскар», — хай і апасродкавана, але прарвалася. На прэмію амерыканскай Акадэміі кінамастацтва «Оскар» намінаваны фільм ірландскага рэжысёра Хуаніты Уілсан «Дзверы» (The Door), заснаваны на адным з фрагментаў кнігі Святланы Алексіевіч «Чарнобыльская малітва».






## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МЕЛІТА СТАНЮТА



www.respublika.info

Беларуская гімнастка Меліта Станюта заваявала чатыры медалі на першым этапе Кубка свету па мастацкай гімнастыцы, што прайшоў у канадскім Манрэалі. Найбольш паспяхова дзяўчына выступіла ў практыкаванні са скакалкай, дзе заняла першае месца, апярэдзіўшы расіянак Дар'ю Дмітрыеву і Яўгенію Канаеву. У трох іншых практыкаваннях Меліта Станюта стала бронзавай медалісткай — з мячом, абручом і стужкай. У шматбор'і гімнастка заняла 5-е месца.

Заслужаны трэнера Беларусі Святлана Бурдзевіцкая ў адным з інтэрв'ю адзначыла, што Меліта — з'ява ў сусветнай гімнастыцы: «Яшчэ ніхто з беларускіх мастачак не ўрываўся так імгненна на пастамент, ды яшчэ ў такім юным узросце. Меліце толькі 16 год, а яна ўжо выйграе ў 20–25-гадовы гімнастак за кошт свайго таленту». Раней галоўны трэнер расійскай зборнай Ірына Вінер назвала Станюту «выдатнай маладой гімнасткай», якая паказвае «цікавую і стабільную» праграму. Яна прадказвала Меліце вялікую кар'ерную будучыню. Эксперты адзначаюць артыстызм дзяўчыны, які, відаць, перадаўся ёй у спадчыну ад прабабулі — слыннай беларускай акторкі Стэфаніі Станюты.

### ІВАН МІХАЙЛАЎ



http://www.svaboda.org

Праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя» прызнала вязнем сумлення Івана Міхайлава, якога 1 лютага суд Мінскага раёна пакараў арыштам на тры месяцы, абвінавачыўшы ва ўхіленні ад вайсковай службы. Міхайлаў кажа, што служыць у войску яму не дазваляюць рэлігійныя перакананні, і спасылаецца на Канстытуцыю Беларусі, якая гарантуе права на альтэрнатыўную службу. «Міжнародная амністыя» заклікае неадкладна вызваліць Івана Міхайлава.

Іван Міхайлаў прызнаны беларускім судом вінаватым у здзяйсненні крымінальнага злачынства «за ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву на воінскую службу». Праваабаронца Алена Танкачова, каментуючы вырак суда, зазначыла: «Гэта выдатны спосаб выканаць «правілы прыстойнасці», прызначыўшы 3 месяцы арышту: не так шмат, як прасіў пракурор, але і роўна столькі, колькі неабходна, каб апраўдаць трыманне ў ізалятары да суда. Але варта падумаць у першую чаргу пра тое, што маладому чалавеку паставілі на лоб таўро на ўсё жыццё — «вінаваты ў здзяйсненні крымінальнага злачынства». Па яе меркаванню, да адказнасці ў такіх выпадках трэба прыцягваць не юнакоў, які хацелі б прайсці альтэрнатыўную грамадзянскую службу, а службовых асобаў, адказных за юрыдычныя аспекты закону і канстытуцыйны парадак у краіне.

### СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ



Мастацкі фільм, зняты па кнізе Святланы Алексіевіч, намінаваны на «Оскар». Як распавёў БелаПАН прадзюсер фільма ў Беларусі, кіраўнік кампаніі Belarus Productions Ілля Кузняцоў, на прэмію амерыканскай Акадэміі кінамастацтва «Оскар» намінаваны фільм «Дзверы» (The Door) ірландскага рэжысёра Хуаніты Уілсан. Кінагісторыя заснаваная на адным з фрагментаў кнігі Святланы Алексіевіч «Чарнобыльская малітва». Стужка была намінавана ў катэгорыі «Лепшы кароткаметражны гульнявы фільм».

Першапачаткова здымкі планаваліся ў Беларусі, папярэдняя падрыхтоўка і падбор акцёраў адбываліся ў Мінску. Затым было прынята рашэнне здымаць у адселеным горадзе энергетыкаў Прыпяць, паколькі менавіта там адбываецца дзеянне кнігі. У аснове кароткаметражнага фільма — гісторыя Мікалая Калугіна, які згубіў дачку ў выніку чарнобыльскай трагедыі. Галоўныя ролі ў фільме выканалі беларускія акцёры Ігар Сігаў (Тэатр беларускай драматургіі, Мінск) і Джульета Казакевіч-Герынг (тэатр «Школа сучаснай п'есы», Масква). Фільм ужо заваяваў шэраг прэстыжных узнагарод на фэстах розных краін. 82-я цырымонія ўручэння прызоў амерыканскай Акадэміі кінамастацтва пройдзе 7 сакавіка ў Лос-Анжэлесе.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# ЛІБЕРАЛЬНАСЦЬ МАЛЫМІ ДОЗАМІ

Марыя КРУК

**Завяршылася фармаванне тэрытарыяльных выбарчых камісій. Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына лічыць, што патрабаванне выбарчага кодэкса аб тым, каб прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў складалі не менш за адну трацíну ў камісіях, цалкам выканана. Аднак у апазіцыйных партыях з пазіцыяй ЦВК не пагаджаюцца, і нават былі спробы адстаяць сваю пазіцыю праз суд.**




Партыя БНФ падавала скаргу ў суд на рашэнне па фармаванню Мінскай гарадской тэрытарыяльнай выбарчай камісіі. Аднак рашэнне суда — не на карысць партыйцаў. Агулам партыя БНФ вылучала шэсць прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных выбарчых камісій, і ніводзін з іх не прайшоў быццам бы з-за дапушчаных памылак пры вылучэнні. Намеснік старшыні Мінскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ Вадзім Канапацкі лічыць, што неўключэнне сябраў партыі ў склад тэрытарыяльных камісій «ставіць пад сумненне гатоўнасць уладаў правесці сумленную выбарчую кампанію». Паводле інфармацыі прэс-службы партыі БНФ, зафіксаваны выпадкі ціску на людзей, прозвішчы якіх былі пададзеныя ў райвыканкам у якасці патэнцыйных сябраў участковых выбарчых камісіяў. Агулам толькі па Мінску партыя вылучыла 150 чалавек у якасці сябраў участковых камісій.

У сваіх прэтэнзіях Партыя БНФ не самотная. Прадстаўнікі Руху «За свабоду» таксама не прайшлі ў тэрытарыяльную выбарчую камісію, але ў Баранавічах. Адкрытага абмеркавання і галасавання па кандыдатурах у склад выбарчай камісіі не было. Супрацоўнікі гарвыканкама і гарсавета зацвердзілі загадзя падрыхтаваны спіс Баранавіцкай гарадской выбарчай камісіі ў складзе 13 асоб. У яго трапілі прадстаўнікі КПБ і партыі «Справядлівы свет», грамадскіх арганізацый «Беларускі саюз жанчын», «Белая Русь», БРСМ, Саюза ветэранаў, Беларускага саюза афіцэраў, прафсаюза дзяржаўных устаноў, а таксама асобы, якіх вылучалі ад працоўных калектываў і шляхам збору подпісаў.

У пачатку лютага, пад завесу прызыўной кампаніі, у войска забралі і актывіста Руху «За Свабоду» Алега Пронскага, якога вылучалі ў склад Гродзенскай абласной выбарчай камісіі.

Агулам, па інфармацыі Цэнтрвыбаркама, заяўкі палітычных партый пры фарміраванні тэрытарыяльных выбарчых камісій былі задаволеныя на 90 працэнтаў. Найбольш у камісіі патрапіла сябраў КПБ — 75 чалавек, ад «Справядлівага свету» — 9 чалавек, з 14-ці сябраў АГП — 4, з васьмі сябраў БСДГ два. Ніводны прадстаўнік з шасці заяўленых ад партыі БНФ у выбаркамы не прайшоў.

Затое прадстаўнічасць праўладных арганізацый у камісіях, па традыцыі, высокая. З 4024 прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў сябраў «Белай Русі» — 517, БРСМ — 527, Беларускага саюзу жанчын — 489, Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў — 303, Федэрацыі прафсаюзаў — 1 882.

Бліжэйшым часам будуць створаныя выбарчыя акругі і акруговыя выбаркамы. Вылучэнне кандыдатаў пачнецца ад 14 лютага. Пасля гэтага можна будзе рэгістраваць ініцыятыўную групу кандыдатаў у дэпутаты і пачынаць збіраць подпісы. Таксама да 14 лютага выканкамы павінны прыняць рашэнне, у якіх месцах нельга арганізоўваць пікеты па зборы подпісаў. Калі такое рашэнне не будзе прынятае, то пікеты можна праводзіць усюды.

Кандыдаты ў дэпутаты абласнога савету атрымаюць з дзяржбюджэту па 280 тысяч рублёў на друк улётак, памяшканне для сустрэчаў і час у эфіры радыё будуць прадастаўленыя бясплатна.

У апазіцыйных колах лічаць, што гэта выбарчая кампанія істотна ад папярэдніх не адрозніваецца. Папраўкі ў выбарчае заканадаўства прадугледжваюць, што трацíну складу выбарчых камісій павінны заняць прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Гэтыя месцы запоўнілі прадстаўнікі праўладных «Белай Русі», ФПБ, БРСМ ды іншых, хаця варта адзначыць, што і апазіцыя не вылучылася вялікай актыўнасцю на стадыі фарміравання тэрытарыяльных выбаркамаў. Наступныя этапы, калі будуць створаныя акруговыя выбаркамы і пачнецца рэгістрацыя кандыдатаў, пакажа, наколькі далёка гатовыя зайсці ўлады ў дэманстрацыі ліберальнасці выбарчай кампаніі. Але прапусканне праз сіта нават таго мізэру прадстаўнікоў апазіцыі, якія вылучаліся ў выбаркамы, гаворыць, што «дабрыня» Цэнтрвыбаркама будзе не бязмежнай, а дазаванай і бяспечнай для адладжанай за гады сістэмы выбараў.

ВЫБАРЫ

# МАНІТОРЫНГ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

Генадзь КЕСНЕР

**Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК) разам з незарэгістраваным Праваабарончым цэнтрам «Вясна» абвясцілі пра пачатак кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». У адпаведнасці з Указам прэзідэнта № 21 ад 2010 года, выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў прызначаны на 25 красавіка.**

Як адзначаецца ў заяве кіраўнікоў праваабарончых арганізацый, «у сувязі з гэтай значнай падзеяй у жыцці нашай краіны мы, беларускія праваабаронцы, заяўляем, што заўжды выступалі і выступаем за свабодныя і справядлівыя выбары, правядзенне якіх дазволіла б умацаваць давер грамадзян да органаў мясцовага самакіравання, паспрыяла б развіццю дэмакратыі ў краіне». Ацэнка этапаў выбарчага працэсу будзе ажыццяўляцца, сыходзячы з іх адпаведнасці выбарчаму заканадаўству Беларусі і міжнародным стандартам, выканання прынцыпаў транспарэнтнасці, свабоды і справядлівасці выбарчага працэсу. Асаблівая ўвага будзе надавацца рэалізацыі новых палажэнняў выбарчага заканадаўства, унесеных напярэдадні палітычнай кампаніі.


Алег Гулак

Па словах старшыні БХК Алега Гулака, маніторынг будзе доўгатэрміновым. «Гэта значыць, што мы ацэньваем у тым ліку і сітуацыю, на фоне якой адбываюцца выбары, паколькі зразумела, што сапраўдныя свабодныя і справядлівыя выбары могуць праходзіць толькі ў той сітуацыі, калі для гэтага маецца дастаткова правоў і свабод, каб людзі маглі свабодна сфарміраваць сваё меркаванне, не баяцца прыйсці ці не прыйсці на выбары, зрабіць усвядомлены выбар, і іх выбар быў бы ўлічаны дакладным і правільным чынам», — падкрэсліў праваабаронца.

Юрыст «Вясны» Валянцін Стэфановіч адзначыў, што не апраўдала сябе і не дзейнічае ў поўнай меры норма, у адпаведнасці з якой у складзе выбарчых камісій, у дадзеным выпадку пасля першага этапу кампаніі — тэрытарыяльных, трацíну павінны складаць прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх арганізацый. «Калі параўноўваць склады камісій на ранейшых выбарах, і тады трацíну складалі прадстаўнікі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, іншая справа, што гэта праўрадавыя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі. Такая ж тэндэнцыя захавалася і зараз», — падкрэсліў праваабаронца.

Старшыня юрыдычнай камісіі БХК Гары Паганяйла паведаміў, што Беларускі Хельсінскі камітэт разам са спецыялістамі ў галіне выбарчага заканадаўства падрыхтаваў і прапанаваў палітычным партыям, усім удзельнікам выбарчага працэсу шэраг рэкамендацый, звязаных з абскарджваннем парушэнняў выбарчага права.

«Гэта тэма вельмі важная для таго, каб адсачыць, наколькі працэдуры выбарчага працэсу будуць адпавядаць тым заканадаўчым нормам, з якімі мы сёння маем справу. Досвед мінулых выбарчых кампаній паказваў, што многія дзяржаўныя структуры і выбарчыя камісіі фармальна ставіліся да абскарджвання рашэнняў выбарчых адміністрацый, дзеянняў выбарчых камісій, іншых удзельнікаў выбарчага працэсу ў сувязі з парушэннямі дзейнага выбарчага заканадаўства. У многіх выпадках суды не прымалі да разгляду скаргі ўдзельнікаў выбарчых працэдур. Сёння гэта больш-менш упарадкавана, у трынаццаці выпадках у Выбарчым кодэксе маюцца прадпісанні аб магчымасцях судовага абскарджвання рашэнняў выбарчых адміністрацый», — адзначыў юрыст.

Па словах кіраўніка «Вясны» Алеся Бяляцкага, перад Цэнтрвыбаркамам і іншымі выбарчымі камісіямі стаіць цяжкая задача правесці цяперашнія мясцовыя выбары «больш-менш прыстойна».

«Я хацеў бы сказаць пра атмасферу страху, якая пануе сёння ў беларускім грамадстве, і асноўны лозунг, які «ўбівалі» выканаўчыя ўлады ў апошнія гады — «не высоўвайся!», — на жаль, спрацоўвае. Аналізуючы сітуацыю 2009 года — аднясна спакойнага, паколькі не было палітычных кампаній, буйных нацыянальных кампаній, тым не менш, трэба адзначыць, што фактычна кожны тыдзень, кожны месяц мы рэгістравалі звальненні палітычных і грамадскіх актывістаў з працы, што, напрыклад, у малых гарадах і мястэчках ствараць праблемы выжывання чалавека і яго сям'і, і такіх выпадкаў за мінулы год у нас зафіксаваны дзесяткі. Гэта тычыцца і студэнтаў, якіх за актыўную грамадзянскую пазіцыю выключалі з ВНУ. І хачу прыгадаць апошні абуральны выпадак, калі прадстаўнікоў розных палітычных партый, што працуюць настаўнікамі, выклікалі ў Мінскі аблвыканкам, дзе ад іх катэгарычна запатрабавалі выйсці з палітычных партый і структур. Гэтай справай зараз займаецца пракуратура... Такія ініцыятывы чыноўнікаў дзесяткамі праяўляюцца ў рэгіёнах, а цэнтральныя ўлады на ўсё гэта глядзяць скрозь пальцы, калі не сказаць, што пакрываюць і нават ухваляюць такую дэпалітызацыю беларускага грамадства», — падкрэсліў Алесь Бяляцкі.


Алесь Бяляцкі

Праваабаронцы заявілі, што ў сваёй працы яны адкрытыя да супрацоўніцтва з усімі дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі, а таксама асобамі, зацікаўленымі ў правядзенні свабодных, справядлівых і дэмакратычных выбараў.

«Мы будзем рады, калі цэнтральныя выбарчыя органы будуць успрымаць наша назіранне як магчымасць зрабіць гэтую сістэму лепшай. Зразумела, што без назірання, без грамадзянскага кантролю палітычная сітуацыя складана. Наша задача — паказваць праблемы перш за ўсё выбарчым органам, а іх задача — гэтыя праблемы вырашаць. Калі мы тут знойдзем паразуменне, то спадзяюся, што нашы наступныя выбары будуць яшчэ лепшымі», — падсумоўваў старшыня БХК Алег Гулак.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КАМУ МЕСЦА Ў ЕЎРАНЭСЦЕ

Вольга ХВОІН

**У склад беларускай дэлегацыі ў парламенцкай асамблеі палітыкі Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» (Еўранэст), верагодна, прадстаўнікі афіцыйных структур не ўвойдуць. З гэтай нагоды старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Сяргей Маскевіч заявіў, што Беларусь увогуле можа выйсці з праграмы «Усходняе партнёрства».**


www.svaboda.org
Сяргей Маскевіч

Пазней у інтэрв'ю афіцыйнаму інфармагенцтву БЕЛТА парламентарый у больш мяккай форме паведаміў, што афіцыйны Мінск будзе настойваць на тым, каб у Еўранэсце ўдзельнічала толькі афіцыйная дэлегацыя. «Нас цікавіць толькі раўнапраўны ўдзел у Еўранэсце. Будзем настойваць, каб беларуская дэлегацыя цалкам фармавалася з прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, і яе колькасны склад быў аднолькавы з дэлегацыямі астатніх усходнееўрапейскіх краін», — сказаў дэпутат. Паводле яго слоў, беларускія парламентарыі гатовыя актыўна працаваць у Еўранэсце, але толькі ў якасці афіцыйных членаў асамблеі, а не назіральнікаў.

Сутнасць канфлікту палягае ў прапанове прадстаўнікоў Еўрапейскага парламента: яны мяркуюць, што ў Еўранэст мусяць увайсці ў якасці назіральнікаў (у дачыненні да Беларусі дзейнічае шэраг санкцый, і яе прадстаўнікі, у адрозненне ад дэлегатаў іншых краін «Усходняга партнёрства», не могуць мець статус сяброў асамблеі) па пяць прадстаўнікоў ад улады і апазіцыі. Калі ўлады Беларусі не пагодзіцца на такія ўмовы, беларуская дэлегацыя можа цалкам складацца толькі з прадстаўнікоў апазіцыі. Папярэдне ёсць інфармацыя, што да ўдзелу ў працы парламенцкай асамблеі Еўранэст могуць быць запрошаныя па адным прадстаўніку ад пяці апазіцыйных партый — кансерватараў, камуністаў, сацыял-дэмакратаў, хрысціянскіх дэмакратаў і лібералаў, а таксама прадстаўнікі грамадскіх рухаў, незалежных СМІ, незалежных прафсаюзаў, рэлігійных і нацыянальных меншасцяў. Беларускіх парламентарыяў у Еўранэсце не чакаюць найперш таму, што ЕС ставіць пад сумленне легітымнасць Палаты прадстаўнікоў. Зрэшты, настойлівая пазіцыя Мінску ўключыць дэпутатаў у склад дэлегацыі мае ідэалагічны, а не практычны матыў, бо ўнутры краіны яны ўплыву не маюць.

Адзін з удзельнікаў Форуму грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства», кіраўнік міжнароднага кансорцыума «ЕўраБеларусь» Улад Вялічка не лічыць мэтазгодным адмаўляць прадстаўнікам уладаў удзельнічаць у працы Еўранэст. «Я не ведаю, на якіх падставах можна выходзіць з праграмы, у якую ты ўвайшоў год таму, — каментуе прадстаўнік НДА заяву Маскевіча аб магчымым выхадзе Беларусі з праграмы «Усходняе партнёрства». — Прапанова Еўрапарламента па фармаванню дэлегацыі слушная тым, што палітычныя групы, якія не маюць магчымасці данесці свой голас да беларускай грамадскасці ўнутры краіны, могуць гэта рабіць на пляцоўцы Еўранэст. Але не вельмі добра, што толькі яны. Хацелася б бачыць на гэтай пляцоўцы і прадстаўнікоў дзяржавы. Ва ўсялякім разе, гэта было б у духу «Усходняга партнёрства», бо праграма перш за ўсё сканцэнтраваная на дыялогу — унутраным, агульнаеўрапейскім».

Напрыканцы лютага ў Мінск прыедзе азнаямленчая місія Еўрапарламента, якая плануе правесці сустрэчы з прадстаўнікамі ўлады і грамадзянскай супольнасці. Апроч абмеркавання ўдзелу Беларусі ў Еўранэсце, місія мае намер азнаёміцца з інфармацыяй наконт апошніх выпадкаў палітычных рэпрэсій у краіне. Запрашэнні ўдзельнікам дэлегацыі будуць накіраваныя на пачатку сакавіка. У Еўранэст увойдуць 60 дэпутатаў Еўрапарламента і па 10 прадстаўнікоў ад шасці краін-партнёраў. Інаўгурацыйная канферэнцыя парламенцкай асамблеі палітыкі Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» запланавана на 24 сакавіка.

ДЫЯЛОГ

# ЕС ДУМАЕ ПРА МАГЧЫМАСЦІ

Вольга ХВОІН

**Для развіцця ўзаемаадносін паміж Беларуссю і Еўрасаюзам перашкодаў няма. Аднак тэмп дыялогу паскорыўся б, калі б афіцыйны Мінск прыняў агульныя дэмакратычныя каштоўнасці ЕС. Такую заяву зрабіў падчас сустрэчы з журналістамі ў Мінску пасол Іспаніі ў Расіі і Беларусі Хуан Антоніа Марк Пухоль.**

З 1 студзеня старшынства ў ЕС перайшло да Іспаніі. Нягледзячы на аддаленасць Пірэнеяў ад Беларусі, дыпламат падкрэсліў, што «ўсходнееўрапейскі вектар — таксама вельмі важны кірунак для развіцця супрацоўніцтва».

Спадар Хуан Антоніа Марк Пухоль зазначыў, што «чым больш прагрэсу Беларусь будзе рабіць у галіне дэмакратыі, тым больш прагрэсу будзе ў адносінах з Еўрасаюзам». «Дэмакратыя — гэта тая каштоўнасць, якую падзяляюць усе краіны Еўропы, — падкрэсліў дыпламат, — асабліва што тычыцца свабодных выбараў і наяўнасці розных палітычных партый. Гэта менавіта тое, што магло б аб'яднаць Беларусь і ЕС, дапамагчы ў наладжванні нашага дыялогу».

Добрым інструментам для развіцця стасункаў з Беларуссю пасол лічыць праграму «Усходняе партнёрства», і ЕС вітае актыўнасць і вялікую колькасць праектаў, якія беларускія ўлады накіравалі на ўзгадненне для рэалізацыі ў яе межах. «Палітыка «Усходняга партнёрства» — гэта рамкі для актыўнага развіцця дыялогу Беларусі і Еўрасаюза. ЕС гатовы паглыбляць адносіны ва ўсіх кірунках, і такая ж глыбіня патрэбная з боку Беларусі. Нам патрэбны агульны, цэльны дыялог, а не ў асобных сферах», — сказаў пасол.

Падчас візіту ў Беларусь Хуан Антоніа Марк Пухоль сустрэўся з кіраўніком Міністэрства замежных спраў Сяргеем Мартынавым. Сярод шэрагу пытанняў абмяркоўваліся і праблемы эканамічнага крызісу. «Еўропе яшчэ патрэбна многае зрабіць, каб стаць моцным, канкурэнтным гульцом на сусветным узроўні. Гэта тычыцца адукацыі, падтрымкі новых тэхналогій, індывідуальных ініцыятыў. Калі Беларусь зацікавіцца досведам Еўрасаюза ў гэтай сферы, то ён будзе рады весці дыялог у гэтым накірунку», — зазначыў пасол.


Хуан Антоніа Марк Пухоль

Нягледзячы на агульны асцярожны тон выказванняў іспанскага дыпламата, усё ж былі агучаныя пэўныя праблемы, што існуюць у стасунках ЕС з Беларуссю. Прагучалі яны з вуснаў пасля Вялікабрытаніі Размары Томас. Дыпламат таксама спачатку зазначыла, што цяпер размова ідзе больш пра магчымасці, а не перашкоды да супрацоўніцтва. Аднак застаюцца і пэўныя пытанні да ўладаў Беларусі, у прыватнасці размова ідзе пра выключэнне актывісткі «Маладога Фронту» Таццяны Шапуцькі з БДУ пасля яе ўдзелу летась у Форуме грамадзянскай супольнасці ў Бруселі. «Мы даведаліся, што скарга Шапуцькі ў Міністэрства адукацыі аб аднаўленні ва універсітэце не была задаволеная, і шкадуем, што падзеі прынялі такі абарот. Мы ўздымалі гэта пытанне з беларускімі ўладамі і спадзяемся вярнуцца да яго ў бліжэйшы час», — паведаміла Размары Томас.

СУПОЛЬНАСЦЬ

# НДА ПАКІДАЮЦЬ РОЛЮ «ПРАСЛОЙКІ»

Вольга ХВОІН

**Прадстаўнікі НДА Беларусі сцвярджаюць, што афіцыйны Мінск не настроены на дыялог з імі ў межах працы Форума грамадзянскай супольнасці праграмы «Усходняе партнёрства».**

Напрыканцы студзеня адбылося першае пасяджэнне Каардынацыйнага камітэта Форума. Паводле слоў кіраўніка кансорцыума «Еўрабеларусь» і кіраўнікі вага каардынатара па Беларусі Улада Вялічкі, цяпер вядзецца актыўная праца ў межах структуры Форума грамадзянскай супольнасці. У прыватнасці, сфарміраваныя працоўныя групы па кожнай з чатырох платформаў «Усходняга партнёрства» — эфектыўнае кіраванне, эканоміка, энергетыка і кантакты паміж людзьмі. Акрамя таго створаны адмысловыя групы з прадстаўнікоў краін-сяброў праграмы «Усходняе партнёрства» і краін ЕС, якія будуць займацца фармуляваннем канцэпцый, падрыхтоўкай другой канферэнцыі Форума, лабісцкай працай, флагманскімі ініцыятывамі, інфармацыйнай палітыкай. Прадстаўнікі НДА звяртаюць увагу на інертнасць працы структур ЕС і неабходнасць у сувязі з гэтым загадзя рыхтаваць прапановы да Форума, каб яны маглі быць уключаныя ў выніковыя дакументы.

Эксперты бачыць праблему для беларускай дэлегацыі не толькі ў абмежаваным распаўсюдзе інфармацыі афіцыйным Мінскам аб дзейнасці ў межах Форума грамадзянскай супольнасці, але і Еўрапейскім саюзам. Еўрапейская камісія, да прыкладу, пакуль не змагла прадставіць звесткі аб праектных прапановах, якія нацыянальныя ўрады падрыхтавалі для рэалізацыі.

Палітолаг Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Дзяніс Мельянцоў падкрэслівае, што, нягледзячы на паспяховасць Форума для беларускай грамадзянскай супольнасці, сама праграма «Усходняе партнёрства» застаецца міждзяржаўнай па сваёй сутнасці. Таму цяпер у Еўрапейскай камісіі не даюць ніякіх гарантый, што прадстаўнікі Форума будуць удзельнічаць у тэматычных панелях праграмы і нейкім чынам уплываць на іх працу.

«Трансфармацыйны патэнцыял «Усходняга партнёрства» малы, бо ад пачатку праграма задумвалася як інструмент да ўцягнення постсавецкіх краін у еўрапейскі працэс, — тлумачыць эксперт. — Еўрапейская камісія не зацікаўленая «прэсаваць» улады, каб яны прыслухоўваліся да меркавання грамадзянскай супольнасці. Форум грамадзянскай супольнасці як такі не быў прадугледжаны першапачаткова. Яго роля — праслойка паміж дзяржаўнымі прадстаўнікамі і еўрапейскімі структурамі, і задачы Форума прэзентуюцца еўрапейскімі чыноўнікамі як кантрольныя і дарадчыя. Таму, калі прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці спрабуюць нейкім чынам ламаць фармат, выходзіць са сваімі праектамі, то гэта выглядае недарэчна для нацыянальных урадаў і чыноўнікаў ЕС. Бо платформы разглядаюцца найперш як месца, дзе грамадзянская супольнасць магла б размаўляць з уладамі».

Фармат «Усходняга партнёрства» яшчэ не да канца сфармаваны. Да сярэдзіны сакавіка будзе прынятае рашэнне пра склад беларускай дэлегацыі ў парламенцкай асамблеі Еўранэст. ЕС прапанаваў уладам Беларусі два варыянты фарміравання дэлегацыі (толькі з прадстаўнікоў недзяржаўных структур, ці ў фармаце 5 + 5), на што прагучала заява аб магчымым выхадзе Беларусі з «Усходняга партнёрства». Мельянцоў лічыць, што падобныя варыянты развіцця падзей трэба пралічваць ужо цяпер і вырашаць, што ў такім разе будзе рабіць беларуская дэлегацыя Форума.

У шэрагу актуалій, якія стаяць перад прадстаўнікамі беларускіх НДА, — фарміраванне лобі-груп, праваабарончых механізмаў, напаўненне праектамі і прапановамі платформаў па эканоміцы і энергетыцы, а таксама інфармацыйная праца. «Дэлегаты Форума павінны самі запаўняць інфармацыйныя прабелы, і больш таго — у сваіх краінах браць на сябе функцыю «еўрапейскага лікбеза», каб зацікаўліваць іншых акцёраў да супрацы», — упэўнены Дзяніс Мельянцоў.

Наступная сустрэча каардынацыйнага камітэта Форума грамадзянскай супольнасці пройдзе ў Кіеве 24–25 сакавіка, працоўных груп — у красавіку-маі. Другая сесія Форума грамадзянскай супольнасці запланаваная прызначаная на 15–16 лістапада.

КІНО

# Андрэй Кудзіненка: «Таркоўшчына» перашкаджае развіццю кінематографа

**Ёсць прымаўка, што жыццё — гэта тое, што адбываецца з вамі, калі вы будуеце абсалютна іншыя планы. Рэжысёр Андрэй Кудзіненка някепска зведаў яе сэнс на сабе. Спачатку патрапіў у стыпендыянты адмысловага фонду кіраўніка Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, затым за сваю стужку «Акупацыя. Містэрыі», што ледзь не легендай стала ў цесненькім асяродку беларускага кіно, — перавандраваў у няміласць да чыноўнікаў ад культуры. У лепшых традыцыях жанру, малады рэжысёр з'ехаў за мяжу, здабыў там досвед ды поспех і з трыумфам вярнуўся на радзіму па запрашэнню тых самым чыноўнікаў. Ды яшчэ на сваіх умовах: здымаць не «партызанку», а нікому невядомы «бульба-хорар».**

**Пра працу рэжысёра ў атачэнні бухгалтараў, расплаўленыя інтэрнэтам мазгі і натуральнасць вурдалакаў з Андрэем Кудзіненкам размаўляла Вольга Хвоін.**


http://gazetaby.com

Андрэй Кудзіненка

***— Чаму пагадзіліся супрацоўнічаць з «Беларусьфільмам»?***

— Мне патэлефанавалі з прапановай супрацоўніцтва, паказалі некалькі сцэнараў, але яны не ўразілі. Тады я прапанаваў свой, з умоваю, што не будуць моцна крэмзаць мастацкую частку, ідэю, бо хацеў зрабіць кіно паводле сваёй задумы.

***— Кіраўнік Мінкульта Павел Латушка на апошняй нарадзе абураўся, што ў Беларусі не здымаецца нічога з мясцовым каларытам. У міфічным сюжэце «Масакры» многа нацыянальнага?***

— Канешне. У Беларусі многа легендаў пра ваўкалакаў ды пярэваратняў. У раёне Мядзела мясцовыя краязнаўцы раскажуць вам гісторыю, падобную да сюжэту фільма, хаця сцэнар нашай казкі, ці «бульба-хорару», пісаўся па навеле Праспера Мерымэ «Локіс». Некалі нарком Луначарскі напісаў па ёй сцэнар, і на нямы фільм «Мядзведжае вяселле» людзі ішлі валам. Нават знакаміты Эйзенштэйн скардзіўся, што яго «Браняносец Пацёмкін» не такі папулярны.

***— Вы самі ў казкі верыце?***

— У казкі — веру. У Дзеда Мароза — не.

***— Чым адрозніваецца арганізацыя працы на студыі Лунгіна і на «Беларусьфільме»?***

— У Паўла Лунгіна, калі мы здымалі «Розыгрыш», адначасова ў вытворчасці знаходзілася тры стужкі. Але фінансавыя справы вялі толькі тры бухгалтары. У «Беларусьфільме» папяровымі справамі займаецца цэлы аддзел. Тут засталася сістэма з савецкіх часоў, і яна вельмі марудная, няўклюдная. Напрыклад, здымачная змена традыцыйна доўжыцца дванаццаць гадзін, у нас — восем. За гэты час не заўсёды можна паспець завяршыць працу, а здымкі вымагаюць часам і чакання надвор'я, нейкіх знешніх адпаведных умоў. Таму многа даводзіцца будаваць на пэўных асабістых зацікаўленасцях, кантактах. Яшчэ адзін момант: у Расіі рэжысёр мае наяўныя грошы для арганізацыі здымак. У нас усе фінансы ідуць праз бухгалтэрыю, пасля выпісвання рахункаў, запаўнення папер, падпісання дазволаў. Самі разумееце, што дынамікі працэсу гэта не надае.

***— На камерцыйны поспех «Масакры» разлічваеце?***

— Хутчэй за ўсё, пасля таго, як праца завершыцца — а мяркуецца гэта зрабіць да чэрвеня, — фільм будзем спрабаваць заявіць на кінафестывалі. Тады лягчэй выходзіць у пракат. У Расіі ў бюджэце фільма рэклама займае каля трыццаці працэнтаў. Рэклама фільма «Піцер FM» увогуле ў два разы перавышала бюджэт на вытворчасць. На «Масакру» было вылучана каля пяці мільярдаў рублёў, больш за трыццаць працэнтаў ад сумы — гэта студыйныя выдаткі, плюс падаткі. На рэкламу запланавана патраціць каля дваццаці мільёнаў рублёў. Глядач цяпер ідзе найперш на рэкламу, а не разбіраецца, якія з пракатных фільмаў добры, а які кепскі. Напрыклад, амерыканская стужка «Змрок» (Twilight) вельмі пасрэдная, але за кошт рэкламы мае добрыя касавыя зборы. Каб беларускае кіно стала камерцыйна паспяховым, трэба зрабіць вельмі многа: ад банальнага развіцця сістэмы кіназалаў да стварэння інстытуту прыватнага прадзюсерства.

***— У Міністэрстве культуры гавораць, што трэба вяртаць у Беларусь маладых спецыялістаў, якія выехалі за мяжу вучыцца кінамастацтву. А гэтыя студэнты думаюць, як замацавацца на рынку працы ў Расіі, Еўропе, ва Украіне. Якім пернікам іх можна заманіць назад?***

— Хай спачатку яны паспрабуюць там застацца, бо не так лёгка замацавацца ў кінаіндустрыі Еўропы. У Беларусі ж трэба ствараць умовы, якія б садзейнічалі актывізацыі кінажыцця. Развіваць фестывальны рух, арганізоўваць міні-гранты для малабюджэтнага кіно, кароткаметражнага, думаць пра прыцягненне спонсараў. Хай сабе спачатку гэта будуць дзяржаўныя праграмы і праекты, але з часам яны маглі б перарасці ў нейкі рух. Цяпер здымаць кіно проста: узяў камеру і зрабіў кіно на сваім кампутары. Можна падумаць пра стварэнне фонду дэбютаў, які напаўняўся б за кошт адлічэнняў з пракату замежных фільмаў. Але галоўнае — стварыць канкурэнцыю, далучыць да працэсу прыватныя студыі. Гэта выявіла б абсалютна іншыя сцэнарыі, новыя варыянты прасоўвання кінапрадукцыі на рынку. Канешне, хацелася б, каб у кінапрацэсе ўдзельнічалі і тэлеканалы, хаця ў нас яны і некамерцыйныя. Цяпер ва ўсім свеце ў вытворчасці кіно найбольш задзейнічана тэлебачанне, а не банкаўскія ці дзяржаўныя структуры.

***— Вы лёгка дрэйфуеце паміж жанрамі кіно. Што найбольш запатрабаванае цяпер, і чаго не хапае на рынку кінапрадукцыі?***

— Цяпер здымаць кіно намнога прасцей, чым дзесяць гадоў таму. Але няма руху знізу. Мы ўвесь час гаворым «дзяржава», а дзе рух знутры? Яго няма. Прыйшло інфантыльнае пакаленне. Канешне, інтэрнэт дае інфармацыйную свабоду, магчымасці кантактаў, але і адначасова растварае мазгі. Чалавек стаў мысліць кліпава, коміксна. Сюжэт, сэнс цяпер падмяняецца дынамікай, відовішчнасцю, спецэфектамі. Серыялы бяруць сваёй сентыментальнасцю, размазанасцю. Форма дамінуе над зместам. У Расіі вялікая праслойка рэжысёраў, якія здымаюць сумнае фестывальнае кіно з разлікам на прызы, сваё элітарнае месца ў грамадстве. Гэта традыцыя з 1980–1990-х гадоў, усе гуляюць у вялікіх мастакоў і хворыя на «таркоўшчыну» і «муратаўшчыну». Я сам люблю і Таркоўскага, і Сакурава. Але лічу, што агулам гэта кепска ўплывае на развіццё кінематографа. Такое кіно мусіць быць, толькі дзе іншыя жанры? Дзе трылеры, камедыі, добрыя дэтэктывы? Вельмі мала моладзевага кіно, дзіцячага ўвогуле няма. Серыялы неяк запаўняюць пустоты, але ў іх і планка ніжэйшая.

***— І што спадабалася з апошніх прагледжаных стужак?***

— З расійскіх фільмаў — «Пятніца 12-е». Свежы фільм, зроблены з гумарам, драйвам, добрым падборам акцёраў. «Шчаслівы канец» — цікавая інтэрпрэтацыя Гогаля.


http://bibikau.livejournal.com

***— Значную частку сваіх фільмаў вы здымалі па сцэнарах Аляксандра Качана. Чым так глянуліся яго работы?***

— Гэта ж добра, што ў рэжысёра ёсць «свой» сцэнарыст, які піша тое, што ты хочаш пабачыць. Феліні, напрыклад, многа працаваў з італьянскім драматургам Тоніа Гуэра. Насамрэч, асабліва гэта тычыцца жанравага кіно, цяпер цяжка знайсці добрага сцэнарыста, які мог бы якасна напісаць гісторыю, адчуваў, што запатрабавана ў грамадстве, не быў адарваны ад рэальнасці, меў не архаічнае мысленне. У Беларусі, і не толькі — вялікая праблема з адукацыяй сцэнарыстаў. Новых імёнаў амаль няма. Сітуацыю можна было б выправіць, стварыўшы якасную сцэнарную школу. Гэта можа быць, напрыклад, сумесны адукацыйны курс ва Усерасійскім дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі. Але галоўнае — павышэнне статусу сцэнарыста і ганарарнай базы. Насамрэч, гэта рэдкая і прэстыжная прафесія, і аплачвацца яна мусіць годна. У Беларусі ганарар сцэнарыста поўнаметражнага фільма — каля трох тысяч долараў, у Расіі — ад дваццаці да ста пяцідзесяці тысяч.

Тое ж тычыцца і рэжысуры. У 1990-я ў Беларусі выпускаліся тры курсы рэжысёраў, але за гэтыя гады ў прафесіі ў Беларусі засталіся адзінкі: ці апантаныя, ці тыя, каму пашанцавала. Многія з'ехалі за межы краіны.

***— У «Масакры» занятыя ў тым ліку і расійскія акцёры. Не знайшлі годных тут?***

— У мяне ёсць як беларускія, так і рускія. Усе, лічу, добрыя. Напрыклад, наша актрыса Паліна Сыркіна — вельмі перспектыўная, еўрапейскага ўзроўню. На ролю князя тут акцёра знайсці не атрымалася — ні па тыпажу, ні па патрабаваннях. Таму запрасілі Дзмітрыя Мілера. У Расіі вялікі выбар, вялікі акцёрскі рынак. На ролі часта запрашаюць расійскіх акцёраў, бо яны вядомыя, глядач ідзе на «зорак». Я падыходжу з іншага боку: трэба браць «незамыленыя» твары, новыя. Канешне, «зорка» нясе камерцыйны складнік, але часам, наадварот, раздражняе. На экране добра бачыць новых людзей.

***— Не кожны рэжысёр можа сказаць, што пасля аднаго праекту адразу займаецца другім. Чым запаўняюцца паўзы паміж дзейнасцю?***

— У любым выпадку, падчас аднаго праекта думаеш пра іншы. Шукаеш грошы, новыя ідэі, сцэнары, магчымасці іх рэалізацыі. Свае паўзы я часта запаўняю наперш фестывалямі. Гэта кантакты, новыя знаёмствы, людзі, месцы. З добрай стужкай па фестывалях можна ездзіць больш трох год, калі захацець. Другое — зноў-такі абдумванне новых ідэй і спосабаў іх увасаблення.

***— Як прыходзяць ідэі? Ёсць варыянт, як стварыць фільм «Моцны арэшак»: чалавек пабіў у ваннай люстэрка, наступіў на яго босай нагою, і тут прыйшло натхненне, дзе і як можна выкарыстаць сітуацыю з босымі нагамі і бітым шклом...***

— Па-рознаму. Сцэнарый можа паўстаць з жыцця, літаратуры, газетнай нататкі. Учора глядзеў фільм з удзела Рычарда Гіра, сцэнарый да якога быў напісаны на аснове артыкула ў «Эсквайры». Можа быць рымейк старога фільма, а можа — сон. Альфрэд Хічкок пісаў, што ўвесь час хацеў ухапіць ідэю са свайго сну, але ніколі не было пад рукою асадкі. Аднойчы запісаў, пабег чытаць нараніцу свае начныя нататкі, а там фраза «хлопец сустрэў дзяўчыну». Геніяльная ідэя!

***— Да вас такія «ідэйныя» сны прыходзяць?***

— Па-рознаму. Гэта можа быць як ідэя, адпраўная кропка. Мне падабаецца прынцып творчасці Міхаіла Чэхава: задай пытанні свайму ўяўленню і чакай адказу. Аднойчы яно дасць адказ у візуальных вобразах ці абстрактных рашэннях.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 8 ЛЮТАГА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона X.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.40** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Сямейнае фэнтэзі «Гары Потэр і філасофскі камень» (ЗША - Вялікабрытанія).
**14.30** Прэм'ера. Дак. фільм «Іван Мележ. Туманы над багнаю». («Белвідэацэнтр»).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.55** Культурныя людзі.
**16.25** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.20** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Вольга Дашчынская» цыклу «Лёгка сказаць».
**18.50, 00.40** «Зона X». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна».
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.55** Адмысловы рэпартаж АТН «Асвенцым. 2010».
**22.10** Містычны трылер «Прарок» (ЗША).
**23.50** Драматычны серыял «Часткі цела-5».
**00.45** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.45** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка». Працяг.
**12.00** «Малахаў+».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.05** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** Прэм'ера. «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. IV сезон.3-я серыя.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.35** Нашы навіны.
**00.50** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.05** «Далёкія сваякі».
**15.30** «Гарачы лёд».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Я - вандроўца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Мы пажэнімся, або ў крайнім выпадку стэлефануемся». Украіна, 2008 г.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».

### лад

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Спартовая драма «Хуткасць» (СССР).
**12.10** «Пра мастацтва».
**12.35** Школа рамонту.
**13.35** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.45** Бухта капітанаў.
**15.20** Тэлебарометр.
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Шпіёнскі дэтэктыў «Памылка рэзідэнта» (СССР). 1-я частка.
**20.30** «Калыханка».
**20.50** Беларуская часіна.
**21.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.45** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.15** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Жывая вакцына доктара Чумакова». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**11.55** Фільм «Лімузін колеру белай ночы».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Фільм «Журботная дама чарвякоў». 2007 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карміліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** «Нічога асабістага».
**23.40** Навіны - Беларусь.
**23.50** «Весткі+».
**00.10** «Мой срэбны шар».

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.35** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**09.05** «Крамлёўская кухня».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «Мангуст-2».
**12.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Мядзведжы кут».
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Агент спецыяльнага прызначэння».
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** «Снежны выходны». Агляд. Часопіс.
**09.35** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген)). HS 145. Камандныя спаборніцтвы.
**11.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Жанчыны. 10км вольным стылем.
**12.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Мужчыны. 15км вольным стылем.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген)). HS 145. Камандныя спаборніцтвы.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Катара. 2-і этап. Прамая трансляцыя.
**15.00** Шары. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ланэлі, Вялікабрытанія). Фінал.
**16.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Мужчыны і жанчыны. Спрынт класічным стылем.
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген)). HS 145. Камандныя спаборніцтвы.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**20.15** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**20.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген)). HS 145. Камандныя спаборніцтвы.
**01.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Мужчыны і жанчыны. Спрынт класічным стылем.
**01.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Еўропа сёння.
**17.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.35** Госць «Белсату».
**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** ПраСвет.
**19.50** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**20.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Раскіданы дом», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Фільматэка майстроў: «Ад-магілы-да-магілы», маст. фільм, 2005 г., Славенія.
**23.00** Аб'ектыў.

## 9 ЛЮТАГА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона X.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна».
**09.05** Меладраматычны серыял «І ўсёткі я кахаю» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Асвенцым. 2010».
**12.10** Псіхалагічная крымінальная драма «Жыццё ў пазыку» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.55** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.35** «Зона X». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Серыял «І ўсёткі я кахаю» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.55** Псіхалагічны дэтэктыў «Басейн» (Францыя-Вялікабрытанія).
**23.45** Драматычны серыял «Часткі цела-5».
**00.45** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.05** «Ігар Мацвіенка. Маэстра ў джынсах».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** Прэм'ера. «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Вербніца». Шматсер.фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік». «Мяжа 45-га. Беластоцкі залом».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Мы пажэнімся, або ў крайнім выпадку стэлефануемся». Украіна, 2008 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Top Gear. Руская версія».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Галіна». Серыял.
**22.00** «Ля параднага пад'езда».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Надзвычайныя гісторыі».
**23.50** «Пантэра». Серыял.

### лад

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Шпіёнскі дэтэктыў «Памылка рэзідэнта» (СССР). 1-я частка.
**11.45** «Запал па культуры».
**12.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.25** Кінаспробы.
**13.45** Мультфільм.
**13.55** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Свая кампанія.
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Шпіёнскі дэтэктыў «Памылка рэзідэнта» (СССР). 2-я частка.
**20.30** Калыханка.
**20.45** Беларуская часіна.
**21.50** Спорт-кадр.
**22.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.50** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Утрапёнасць Барыса Андрэева». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карміліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** Прэм'ера. «Забойная вадкасць».
**00.45** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.05** «Следства вялі...».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Кватэрнае пытанне».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «Мангуст-2».
**12.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Мядзведжы кут».
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Галоўны герой прадстаўляе...».
**00.25** «Фатальны дзень».

### EUROSPORT

**09.30, 02.15** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі. Турнэ 4-х трамплінаў. HS 137.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 140.
**13.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**13.30** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Катара. 3-і этап. Прамая трансляцыя.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**20.40** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**21.10** Бокс. Паядынак за тытул чэмпіёна свету па версіі WBA у Германіі.
**22.00** Бокс.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**00.30** Аўтаспорт. Аўтагонкі 24 гадзіны Дайтана (ЗША).
**01.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Праект «Будучыня».
**17.35** «Бульбаны», мультсерыял.
**17.50** Дакументальная гадзіна: «Белы тэрор», дак. фільм, 2006 г., Францыя.
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** «Электравік», дак. фільм, 2005 г.
**19.55** Беларусы ў Польшчы.
**20.15** Акно ў Еўропу.
**20.40** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

## 10 ЛЮТАГА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «І ўсёткі я кахаю» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Дарога, вядучая да шчасця» (Расія).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.55** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** «Зямельнае пытанне».
**20.00** Меладраматычны серыял «І ўсёткі я кахаю» (Расія). Заключная серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Кінараман «Правілы вінаробаў» (ЗША).
**00.10** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела-5» (ЗША). Заключная серыя.
**01.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсер. фільм. Закл. серыя.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер.фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** «Вербніца». Шматсер. фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Пантэра». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Ваенная таямніца».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Галіна». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.55** «Галіна». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**23.50** «Пантэра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Шпіёнскі дэтэктыў «Памылка рэзідэнта» (СССР). 2-я частка.
**11.45** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.25** Спорт-кадр.
**12.55** «Блаславіце наведаць мясціну...» Дакументальны фільм (БТ).
**13.25** Мультфільм.
**13.35** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.00** Пазакласная гадзіна.
**14.25** Лабірынты: маёнтак Талстых у Беларусі.
**14.45** Медычныя таямніцы.
**15.15** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.00** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**17.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.35** Шпіёнскі дэтэктыў «Лёс рэзідэнта» (СССР). 1-я частка.
**20.15** «Калыханка».
**20.35** Беларуская часіна.
**21.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Арсенал - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**23.40** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.05** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».

**РОССИЯ** телеканал

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Маршалы Перамогі: Жукаў і Ракасоўскі». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** Прэм'ера. «Калькутскі капкан. Памылка экіпажу». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Выратавальнікі».
**09.05** «Вочная стаўка».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Дачны адказ».
**11.50** Дэтэктыўны серыял «Мангуст-2».
**12.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.15** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Мядзведжы кут».
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**23.40** «Позняя гутарка».
**00.25** «Першая кроў».

**EUROSPORT**

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit (Сочы, Расія).
**10.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Дзень 2-і.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 130.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Бішафсхофен). Турнэ 4-х трамплінаў. HS 140.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**17.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген)). HS 145.
**18.45** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**19.15** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Абранае па серадах.
**20.20** Конны спорт. Кубак свету ў Францыі (Бардо). Канкур.
**21.20** Навіны коннага спорту.
**21.25** Гольф. Тур PGA. Турнір Northern Trust Open (Лос-Анджэлес, ЗША).
**22.25** Гольф. Еўратур. Desert Classic (Дубаі, ААЭ).
**22.55** Гольф-клуб.
**23.00** Ветразевы спорт. Рэгата Rolex Sydney Hobart.
**23.30** Яхт-клуб.
**23.35** Абранае па серадах.
**23.45** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Дзень 3-і.
**01.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Эстоніі (Талін). Паказальныя выступы.
**02.15** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** На колах.
**17.35** «Дарога на Вільню», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**17.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**18.45** Чалавек і вайна: «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, Вялікабрытанія: 2 серыя.
**19.30** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.35** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.50** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Расія», ч. 2.
**20.25** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Смяротная нявіннасць», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**22.45** Аб'ектыў.

## 11 ЛЮТАГА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** Меладраматычны серыял «І ўсёткі я кахаю» (Расія). Заключная серыя.
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Шуміліна. Вяртанне ды вытокаў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Прыгодніцкая меладрама «Пераможца» (Расія-Украіна).
**14.05** Уласны персонал.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.55** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.10** Прэм'ера. Псіхалагічная любоўная драма «Кіпень» (Расія).
**00.10** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**19.00** Прэм'ера. «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Крэм». Шматсер. фільм.
**22.05** «Вербніца». Шматсер. фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «На ноч гледзячы».
**00.15** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Пантэра». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Надзвычайныя гісторыі».
**14.40** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Галіна». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Галіна». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтэрас».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сакрэтныя гісторыі».
**23.50** «Пантэра». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Шпіёнскі дэтэктыў «Лёс рэзідэнта» (СССР). 1-я частка.
**11.55** Прэм'ера. Дак.-пазнавальны фільм «Вандраванне па Эльзасе» (Францыя).
**12.50** Экспедыцыя.
**13.15** Бітва экстрасэнсаў.
**14.20** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**14.45** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Жывы гук.
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Шпіёнскі дэтэктыў «Лёс рэзідэнта» (СССР). 2-я частка.
**20.35** Калыханка.
**20.50** Беларуская часіна.
**21.50** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.20** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**23.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

**РОССИЯ** телеканал

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Тэрыторыя дзяцінства. Лікбез для дарослых». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**22.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**23.25** Навіны - Беларусь.
**23.35** «Весткі+».
**23.55** Прэм'ера. «Вогненны рэйс. Як гэта было». Дакументальны фільм.

**НТВ**

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Іх норавы».
**09.05** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Жаночы погляд».
**11.35** Дэтэктыўны серыял «Мангуст-2».
**12.25** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Мядзведжы кут».
**21.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Агент адмысловага прызначэння».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Алтар Перамогі». Зброя пераможцаў.
**00.30** «Асабліва небяспечны!».

**EUROSPORT**

**09.30** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.
**09.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Польшчы (Закапанэ). HS 134.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 213.
**13.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Катара. 4-ы этап.
**14.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Катара. 5-ы этап. Прамая трансляцыя.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**19.45** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**22.15** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Сусветны Гран-пры. К 1 (Токіо). Фінал.
**00.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.30** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**02.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**02.15** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.40** «Пяцёра дзетак і Пескавік», маст. фільм, 2004 г., Вялікабрытанія–ЗША.
**19.05** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.45** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**20.15** Форум (ток-шоу): "Усе мы спажыўцы".
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял.
**22.10** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

## 12 ЛЮТАГА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрэсаў.
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя» (Расія). 1-я серыя.
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.35** Прэм'ера. Дэтэктыў «Гераіня свайго рамана» (Украіна).
**14.15** Шпілька.
**14.45** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** «OFF STAGE LIFE».
**15.40** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.35** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.35** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.35** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Фантастычны баявік «Бэтмэн назаўжды» (ЗША).
**00.15** Дзень спорту.
**00.25** Фантастычны баявік «Бэтмэн і Робін» (ЗША - Вялікабрытанія).
**02.35** Іранічная драма «Бацька» (Францыя).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Музычны суд».
**22.25** Наша «Белараша».
**23.00** Фільм «Рабаванне на Бэйкер Стрыт».
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10, 17.20** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Пантэра». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.50** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.45** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Галіна». Серыял.
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Алекс і Эма». ЗША, 2003 г.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «У пагоні за Эмі». ЗША, 1997 г.
**01.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.00** У гэты дзень.
**09.05** Жансавет.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**11.20** Шпіёнскі дэтэктыў «Лёс рэзідэнта» (СССР). 2-я частка.
**12.35** Дак. фільм «Сад маёй душы».
**13.00** Прэм'ера. Анімацыйны фільм «Сакрэт ніндзя» (Францыя - Іспанія).
**14.20** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.10** Свая музыка. Працяг.
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Пра мастацтва.
**19.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.20** Калыханка.
**20.40** Бітва экстрасэнсаў.
**21.45** «Хто вы, містэр Барак Абама?» Дакументальны фільм (Расія).
**22.30** Крымінальная драма «Пусты дом» (Паўднёвая Карэя - Японія).
**00.05** Тэлепорт.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** Пакой смеху.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Фільм «Палюбоўнік».
**00.25** Прыгодніцкі фільм «Вялікае золата містэра Грынвуда».

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Асабліва небяспечны!».
**09.10** «Алтар Перамогі».
**10.20** «Сяржэдні клас».
**10.55** «Галоўны герой прадстаўляе...».
**11.40** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**12.30** «Асабліва небяспечны!».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі...».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.55** «Суперстар» прадстаўляе: «Аляксандр Розэнбаум. Мужчыны не плачуць».
**22.55** Моладзевая камедыя «Дзяўчынка ў хлопчыку. Хлопчык у дзяўчынцы».
**00.35** Містычны трылер «Жах Аміцівіля».

### EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**10.00** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.
**10.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Канадзе (Кэнмор). Мужчыны і жанчыны. Спрынт класічным стылем.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Клігенталь). HS 140.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген)). HS 145.
**13.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Катара. 6-й этап. Прамая трансляцыя.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). 1/4 фіналу. Прамая трансляцыя.
**17.45** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**18.15** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**18.30** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Трэніроўка. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**19.45** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Канада). Прамая трансляцыя.
**21.00** Горныя лыжы. Жанчыны. Хуткасны спуск і камбінацыя. Трэніроўка. Зімовыя Алімпійскія гульні (Канада). Прамая трансляцыя.
**21.45** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Трэніроўка. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**23.45** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**00.45** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.
**01.15** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**01.45** Зімовыя віды спорту. Зімовыя Алімпійскія гульні. Часопіс.
**02.15** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**03.15** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Трэніроўка. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** На колах.
**17.40** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.25** Форум (ток-шоу): «Усе мы спажыўцы».
**19.05** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Расія», ч. 2.
**19.30** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.35** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.45** Беларусы ў Польшчы.
**20.05** Невядомая Беларусь: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Чалавечая прырода», маст. фільм, 2001 г., ЗША.
**22.50** Аб'ектыў.

## 13 ЛЮТАГА, СУБОТА

**03.55** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Цырымонія адкрыцця. Прамая трансляцыя.
**06.30** Мультфільмы.
**07.30** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.35** Дэтэктыўны серыял «Шпікі раённага маштабу-2» (Расія).
**10.25** Шпілька.
**10.55** Ранішняя хваля.
**11.30** «OFF STAGE LIFE».
**11.45** Відэафільм АТН «Капыль. Аповесць даўніх шляхоў» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.35** Сямейная камедыя «Падкідыш» (СССР).
**13.50** Вакол планеты.
**14.30** Відэафільм АТН «Лілія Пташук» цыклу «Лёгка сказаць».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Цырымонія адкрыцця.
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** «КЕНО».
**19.25** Прэм'ера. Зорныя танцы. Мужчынскі сезон. Перадача 1-я.
**21.00** Панарама.
**21.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**22.55** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Біятлон. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**00.25** Уласнай персонай.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Мой радавод.
**12.00** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Звяз».
**12.30** «Кінаметры вайны».
**13.00** «Снайпер. Зброя адплаты». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.20** Камедыя «Джэнтльмены поспеху».
**18.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка».
**22.20** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.55** Фільм «Казароза».

**06.55** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.20** Фільм «Госця з будучыні». СССР, 1984 г. 3-я і 4-я серыі.
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.45** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** Фільм «Дуэння». СССР, 1978 г.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.30** СТВ прадстаўляе: Прэм'ера! «Вялікі горад».
**18.00** Фільм «Казка пра жанчыну і мужчыну». Украіна, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Гісторыя пра Трыстана і Ізольду». Германія - ЗША- Вялікабрытанія-Чэхія, 2006 г.
**23.45** Фільм «Правілы кахання». Італія, 2000 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**08.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.30** Усё аб бяспецы.
**09.00** Тэлепорт.
**09.25** «Хто вы, містэр Барак Абама?» Дакументальны фільм (Расія).
**10.15** Жансавет.
**10.55** Свая кампанія.
**11.40** Лабірынты: Бенедыкт Дыбоўскі.
**12.05** «Запал па культуры».
**12.50** «Av initio. Ад пачатку». Дакументальны фільм аб Прэзідэнцкім аркестры Рэспублікі Беларусь («Белвідэацэнтр»).
**13.15** Серыял «Сяброўка банкіра» (Расія). 1-я - 4-я серыі.
**17.15** Жаночая ліга.
**17.45** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.40** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Скачкі з трампліна. Фінал. Прамая трансляцыя.
**21.40** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Горналыжны спорт. Мужчыны. Каньказабежны спорт. 5000м. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**00.35** Жывы гук.
**01.15** Казанова.

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** Мультфільмы.
**07.40** Прыгодніцкі фільм «Вялікае золата містэра Грынвуда».
**08.50** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** Фільм «Палюбоўнік».
**13.00** «Формула ўлады»..
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Пакой смеху».
**15.10** Дэтэктыў «Сіцыліянская абарона».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі.
**19.45** «Гарадок». Дайджэст.
**20.20** Фільм «Пяшчотны Барс». 2006 г.
**23.30** Фільм «Агітбрыгада «Бі ворага!».

### НТВ

**06.00** Моладзевая камедыя «Дзяўчынка ў хлопчыку. Хлопчык у дзяўчынцы».
**07.30** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.25** «Авіятары».
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.10** Камедыйны баявік «Вясельная вечарынка».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.15** «Вочная стаўка».
**18.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Рускія сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.05** Прэм'ера. Фантастычны экшн-трылер «Знак».
**01.10** Трылер «Сталёвая пастка».

### EUROSPORT

**04.00** Цырымонія адкрыцця Зімовых Алімпійскіх гульняў (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**07.00** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**07.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Трэніроўка. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**08.10** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**08.20** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**09.20** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**09.25** Цырымонія адкрыцця Зімовых Алімпійскіх гульняў (Ванкувер, Канада).
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Цырымонія адкрыцця Зімовых Алімпійскіх гульняў (Ванкувер, Канада).
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Трэніроўка. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**18.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**19.30** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**21.30** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**23.00** Біятлон. Жанчыны. 7,5 км. Спрынт. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**00.15** Канькабежны спорт. Мужчыны. 5000 м. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**00.30** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**02.00** Біятлон. Жанчыны. 7,5 км. Спрынт. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**03.00** Шорт-трэк. Мужчыны. 1500 м. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Еўропа сёння.
**17.40** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** Чалавек і вайна: «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія: 3 серыя.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** ПраСвет.
**20.00** «Радаводны знак», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Суботні сеанс: «Кідалы ў гульні», крымінальная камедыя, 2006 г., Расія.
**22.45** Аб'ектыў.

## 14 ЛЮТАГА, НЯДЗЕЛЯ

**Першы канал (1)**

**07.35** Фільм-казка «Прынцэса на гарошыне» (СССР).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.20** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.30** Nota Bene.
**12.10** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.35** Эксцэнтрычная камедыя «Дрэсіроўшчыца тыграў» (СССР).
**14.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Bravissimo, Андрэй! Адлюстраванне зніклага часу».
**15.55** «Гараскоп кахання». Святочны канцэрт да Дня святога Валянціна.
**18.00** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.05** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**22.55** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Горналыжны спорт. Жанчыны. Канькабежны спорт. 3000м. Жанчыны. Прамая трансляцыя.

**АНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Песні Перамогі».
**13.30** Фільм «Экіпаж».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Меладрама «Варанька». Расія, 2007.
**18.00** Легендарнае кіно «Волга-Волга».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон».

**СТВ**

**07.05** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.55** Фільм «Алекс і Эма». ЗША, 2003 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відвочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**14.05** Фільм «Тэатр». СССР, 1978 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Палюбоўнікі». ЗША, 2008 г.
**22.40** «Тэніс. Кубак Федэрацыі- 2010. Партугальскі вояж».
**23.10** Фільм «Два дні ў Парыжы». Германія-Францыя, 2007 г.
**00.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**ЛАД**

**05.25** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Фрыстайл. Жанчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**06.45** Дабравест.
**07.10** Мір вашай хаце.
**07.20** Смачна з Барысам Бурдой.
**07.40** Меладрама «Спакуса». Беларусь.
**09.20** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Дарагія лялькі» («Беларусьфільм»).
**10.00** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.45** Кінаспробы.
**12.05** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Гаспадар.
**13.25** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Проста Хлеб» (Беларускае тэлебачанне).
**13.55** Серыял «Сяброўка банкіра» (Расія). 5-я - 8-я, заключная, серыі.
**17.40** Рамантычная камедыя «Інтуіцыя» (ЗША).
**19.20** Экспедыцыя.
**19.55** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Горналыжны спорт. Жанчыны. Біятлон. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**22.35** Тэлебарометр.
**22.55** Свая музыка. Працяг.
**23.25** Пасоўванне +.

**РОССИЯ**

**07.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**07.30** Мультфільмы.
**07.55** Фільм «Пяшчотны Барс». 2006 г..
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**12.20** Фільм «Ты памятаеш».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Запаветны камень Барыса Макравусава».
**15.30** Фільм «Вялікая сям'я».
**17.20** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.05** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.00** Фільм «А вы яму хто?». 2006 г.

**НТВ**

**05.45** Фантастычны экшн-трылер «Знак».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўская кухня».
**14.10** Камедыйны баявік «Дом гневу».
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Дэтэктыўны серыял «Следапыт».
**00.05** «Авіятары».

**EUROSPORT**

**04.00** Шорт-трэк. Мужчыны. 1500 м. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**05.30** Фрыстайл. Могул. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**06.30** Санкавы спорт. Мужчыны. Кваліфікацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**07.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**08.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**08.25** Біятлон. Жанчыны. 7,5 км. Спрынт. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**09.25** Скачкі на лыжах з трampліна. HS 106. Мужчыны. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**11.00** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**12.00** Біятлон. Жанчыны. 7,5 км. Спрынт. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**15.00** Біятлон. Жанчыны. 7,5 км. Спрынт. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Горныя лыжы. Мужчыны. Хуткасны спуск. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. HS 106. Мужчыны. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Горныя лыжы. Жанчыны. Хуткасны спуск і камбінацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**21.15** Біятлон. Мужчыны. 10км. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**22.30** Лыжнае дваяборства. HS 134. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**23.00** Горныя лыжы. Жанчыны. Слалам і камбінацыя. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**00.00** Лыжнае дваяборства. Мужчыны. 10км. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**00.30** Шорт-трэк. Жанчыны. 3000 м. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**01.00** Санкавы спорт. Мужчыны. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**03.00** Фігурнае катанне. Пары. Кароткая праграма. Зімовыя Алімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.

**БЕЛСАТ tv / BELSAT**

**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.20** Дакументальная гадзіна: «Музычныя партызаны», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** «Афганец», дак. фільм, Польшча.
**19.55** МакраФон: «Салідарныя з Беларуссю–2008», канцэрт: выступ гурта «IQ48».
**20.30** Акно ў Еўропу.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.30** «Фанфан-Тульпан», маст. фільм.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня
Кассир Всего

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЭТНАПАЛІТЫКА

# ПЕРАПІС, або БІТВА НАРОДАЎ

Іван БІЧ

**У Расійскай Федэрацыі хутка пачынаецца перапіс насельніцтва. Фальсіфікацый наўрад ці атрымаецца пазбегнуць, паколькі для шматлікіх мясцовых нацыянальных эліт перапіс стане бітвай за свае правы і прывілеі.**

Сваю ролю ў эскалацыі напружанасці адыграла ў тым ліку і нядаўняя рэмарка Барыса Грызлова, спікера Дзяржаўнай думы, лідэра партыі «Адзіная Расія». Ён падзяліўся з журналістамі ідэяй ліквідаваць некаторыя суб'екты РФ, якія, на яго думку, не адпавядаюць пэўным крытэрам. Хаця размова ішла перш за ўсё пра эканоміку, на перыферыі гэту заяву ўспрынялі як пагрозу дзяржаўнасці малых народаў. Важным контраргументам Маскве можа быць нацыянальная статыстыка.

Аднак і без заўваг Грызлова было зразумела: усё ідзе да таго, што перапіс–2010 стане нечым накшталт выбарчай кампаніі. Каб стварыць ілюзію легітымнасці палітыкі ў рэспубліках і абгрунтаваць свае этнакратычныя метады кіравання, мясцовым элітам патрэбна пэўная лічба. Таму няма сумневаў, што на выніках перапісу адаб'юцца валявое ўмяшанне мясцовай улады ў працэс самаідэнтыфікацыі грамадзян, а таксама магчымыя фальсіфікацыі.

Так, спікер Дзяржрады Татарстана Фарыд Мухаметшын заклікаў дэпутатаў пачаць «сур'ёзную тлумачальную працу» сярод насельніцтва па падрыхтоўцы да перапісу–2010. «Важным аспектам» хуткага перапісу ён лічыць тое, што «збор дадзеных па колькасці прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў Расіі будзе дакладны». За гэтай канцылярскай фармулёўкай хаваецца заклапочанасць кіраўніцтва Татарстана праблемай захавання і памнажэння колькасці татар у краіне.

Прычына простая: татары — другі па колькасці народ у Расіі пасля рускіх. Паводле перапісу 2002 года, іх было ў краіне больш за 5,5 мільёна чалавек (амаль 4% насельніцтва РФ). Для шматлікіх кіраўнікоў Татарстана такая адносна вялікая колькасць татар сярод жыхароў Расіі стала важным козырам. Вялікі народ — вялікая палітыка, а значыць, у мясцовых кіраўнікоў ёсць магчымасць прад'яўляць Цэнтру патрабаванні і прасіць для сябе адмысловы статус.

Цікава, што ў Казані сапраўды баяцца, што Масква захоча раскалоць татарскую нацыю (большасць татар жыве па-за межам Татарстана). Быццам татарам у Сібіры будзе прапанавана запісваць сябе «сібірскімі татарамі», у Паволжы — «волжскімі» г. д.

Затое самі татарскія ўлады яўна «адарвуцца» на маленькіх этнасах на тэрыторыі Татарстана.

Аднак самая цікавая сітуацыя з перапісам склалася ў Башкірыі. З часоў стварэння аўтаноміі ў СССР башкіры былі тут у меншасці. Па выніках перапісу 1989 года, іх быў 21% ад агульнай колькасці насельніцтва. Калі прыйшоў час праводзіць першы постсавецкі перапіс, урад Башкірыі вырашыў пагуляць са статыстыкай. У выніку колькасць башкір сенсацыйна вырасла да 29 працэнтаў. Гэта пры тым, што ўся Расія перажывала ў той час дэмаграфічны спад. Хутчэй за ўсё, патрэбную лічбу намалявалі галоўным чынам за кошт татар, якіх у 1989 годзе ў мясцовай нацыянальнай структуры было 30 працэнтаў, а ў 2002-м стала толькі 20 працэнтаў. Прынамсі татарскія арганізацыі кажуць, што 250 тысяч татар дзякуючы фальсіфікацыям сталі башкірамі. Між тым, спецыялісты па дэмаграфіі кажуць, што нават пры самым нізкім узроўні прыросту колькасць татар мусіла вырасці. Пра тое, што адміністрацыйны рэсурс быў галоўным фактарам росту колькасці тытульнага этнасу, таксама сведчыць параўнанне вынікаў перапісу ў Башкірыі з паказчыкамі ў суседніх рэгіёнах, якія знаходзяцца ў падобных эканамічных і кліматычных умовах.

Ускосна пра тое, што заложнікамі падтасоўкі сталі менавіта татары, сведчыць і грамадская атмасфера, на фоне якой праходзіў той перапіс. У той жа час ва Уфе адбылася канферэнцыя гісторыкаў пад інтрыгуючай назвай «Супраць фальсіфікацыі гісторыі Башкірыі». Па яе выніках у Маскву на адрас Пуціна даслалі зварот. У тэксце звароту татар чамусьці называюць гістарычнымі ворагамі Расіі, у адрозненні ад башкір.

Некаторыя фрагменты дакументу вартыя, каб іх цытаваць: «Мы, удзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі, адзначаем, што ўмацаванне дэмаграфічнага патэнцыялу башкірскага народа аб'ектыўна адпавядае палітычным інтарэсам як Расійскай дзяржавы, так і рускага народа, паколькі башкіры з'яўляюцца неабходнай процівагай для татарскай экспансіі ў Волга-Уральскім рэгіёне. Стварэнне Татарскага пояса, які працягнуўся праз увесь Урала-Паволжскі арэал да Казахстанскіх стэпаў, не можа адпавядаць доўгатэрміновым геапалітычным інтарэсам Масквы. Нездарма як царскі, так і савецкі ўрады асцерагаліся росту ўплыву татарскага фактару ў этнапалітычнай мазаіцы цюркскіх народаў і прыкладалі значныя сілы для таго, каб стрымліваць амбіцыі Казані».

Сёння перад Уфой стаіць задача як мінімум паўтарыць лічбу васьмігадовай даўніны. Прычым зрабіць гэта будзе вельмі цяжка. Пасля падзей 2002 года да Башкірыі ў федэральным дэпартаменце статыстыкі асаблівая цікавасць. Па-другое, брутальнае ўжыванне адміністратыўнага рэсурсу можа быць выкарыстана Масквой як падстава для змены кіраўніцтва рэспублікі.

Аднак пакуль цяжка сказаць, як згуляе Рахімаў. Калі верыць блогерам, сітуацыя знешне падобная на 2002 год. Ужо пачалася падрыхтоўка друкаваных матэрыялаў для раздачы ў татарскіх раёнах Башкірыі, у якіх татарам даводзяць, што яны не татары, а самыя што ні ёсць сапраўдныя башкіры. Вялікі парадокс заключаецца ў тым, што шмат хто з башкірскіх татар сапраўды этнічныя башкіры. Татарамі ў свой час называлі шматлікіх башкір, якія перайшлі на аселы лад жыцця. Башкірамі, у сваю чаргу, называлі тых, хто застаўся качэўнікамі.

У любым выпадку, на гэты раз Уфа гуляе больш асцярожна. У мясцовых СМІ шмат публікацый пра гістарычнае башкірска-татарскае сяброўства, пра двух братоў, пра два крылы адной птушкі і г.д. У кастрычніку мінулага года адбыўся візіт ва Уфу Рыната Закірава, старшыні Сусветнага кангрэсу татар, якога асабіста прыняў Муртаза Рахімаў.

Акрамя таго, у башкірскага кіраўніцтва ёсць дадатковы джокер. Сам факт публікацыі радыкальна абноўленага колькаснага складу этнічных груп у той жа Башкірыі можа выклікаць абвастрэнне міжнацыянальных адносін, што Маскве зараз абсалютна не патрэбна.




Татары — другі па колькасці народ у Расіі пасля рускіх. Паводле перапісу 2002 года, іх было ў краіне больш за 5,5 мільёна чалавек (амаль 4% насельніцтва РФ)

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Абодвум бакам не выгадна было зацягваць канфлікт, улічваючы некаторыя вонкавыя чыннікі. Расійскі «Газпрам» сёлета плануе пачаць будаўніцтва аднаго з новых газаправодаў, і залішняя мітусня вакол паставак энергарэсурсаў яму не патрэбна. Беларусы таксама добра разумеюць, што працяглае супрацьстаянне нічым добрым не скончыцца. У 2007 годзе, пасля аднаго з такіх канфліктаў, Расія актывізавала стварэнне новага нафтаправода ў абыход беларусаў.

**«Взгляд» (Расія)**

Некаторыя акалічнасці развіцця ўнутранай і знешняй палітыкі Беларусі таксама паказваюць на існаванне глебы для далейшага расколу з РФ. У канцы мінулага года Мінск абвясціў пра намер распрацаваць новую «Сістэму нацыянальнай бяспекі». Разынкай гэтага дакумента можа стаць пункт пра забеспячэнне энергетычнай бяспекі з намёкам на праблемы з Расіяй. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка актыўна развівае двухбаковыя адносіны з туркменскім калегам, у тым ліку таксама для забеспячэння прамых паставак энерганосьбітаў. Варта ўзгадаць і пра паглыбленне кантактаў Беларусі з МВФ. Дарэчы, апошні спрабуе атрымаць ролю медыятара ў нафтавай спрэчцы паміж РФ і РБ. Усё гэта кажа пра тое, што напамін Кангрэса ЗША пра нелегальны збройны бізнес Беларусі можа мець шматпланавае прыкладанне да бягучай сітуацыі. Відома, меркаваць, што сам па сабе гэты крок можа пасварыць Маскву і Мінск, падстаў няма. Але ў дачыненні да іншых фактараў гэта можа адыграць сваю ролю.

**«Комментарии» (Украіна)**

Дамова, якую Масква і Мінск дасягнулі пасля доўгай і працяглай нафтавай вайны, хутчэй за ўсё, толькі падштурхне Аляксандра Лукашэнку да рэалізацыі праекта Адэса—Броды, і адпаведна, адштурхне ад Расіі. Нягледзячы на «добрую міну» беларускага кіраўніцтва, у нафтавай вайне яны панеслі вялікія фінансавыя страты. Відавочна, што Беларусь перастала быць нафтавым афшорам. У той жа час ад сваіх пазіцый Мінск не адступіў і прадаць свае заводы расіянам не пагадзіўся. Гэта можа азначаць толькі адно: у Аляксандра Лукашэнкі маюцца іншыя планы адносна выкарыстання гэтых прадпрыемстваў... Ды і настойлівае запрашэнне Польшчы і Украіны ўдзельнічаць у праекце Адэса—Броды—Гданьск таксама як ніколі своечасовае.

**«Независимая газета» (Расія)**

Час пакажа, у што выльецца гэта не пазбаўленая ўнутраных супярэчнасцяў канфігурацыя новай апазіцыі. Беларускія ўлады заўсёды на крок апярэджвалі апазіцыю. Беларускі рэжым даўно ўжо на справе, а не словах рэалізаваў гэту самую «незалежнасць». Толькі дзяржаўная незалежнасць Рэспублікі Беларусь увасабляецца на практыцы сыходзячы з прымітыўных матэрыяльных інтарэсаў беларускага чыноўніцтва, а не ў памяць Вітаўта Вялікага і бел-чырвона-белага сцяга. Але тым больш надзейна… Беларускаму незалежніцкаму блоку (БНБ) і да іх падобных наўрад ці атрымаецца перагуляць цяперашнюю ўладу і на глебе правага папулізму і на глебе флірту з царквой. Тут дзяржава ўсё трымае пад кантролем, а па часткі таго, як трэба размаўляць з кансерватыўным абывацелем, прэзідэнт Лукашэнка дасць фору кожнаму. Так што ў перспектыве барацьба БНБ з «таталітарызмам», «камунізмам» будзе найбольш паспяховай толькі ў дачыненні да былых таварышаў па калісьці адзіным дэмакратычным руху.

**«Рабкор» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ІТАЛІЯ. ПАРАНДЖУ ЗАБАРОНЯЦЬ

Італьянскія ўлады вывучаюць досвед Францыі, дзе не так даўно было забаронена нашэнне параджы, для прыняцця падобнага закона ў Італіі. Прычым імпартаваць французскія заканадаўчыя інавацыі мяркуюць хуткімі тэмпамі. Па словах міністра роўнасці, ужо праз некалькі тыдняў будзе падрыхтаваны праект новага закону. Неабходнасць забароны традыцыйнага ісламскага адзення міністр тлумачыць самымі высакароднымі мэтамі: «Гэта дапаможа маладым эмігрантам вырвацца з гета». Аднак падобная аргументацыя не задавальняе апазіцыю. Лідэр адной з вядучых партый левай апазіцыі заявіў, што нашэнне параджы — гэта праява індывідуальнасці. Цікава, што ў Італіі яшчэ з 1975 года існуе закон, які забараняе хаваць твар на публіцы. Аднак прыняты ён быў не з-за пагрозы ісламізму, а з-за актыўнасці левых радыкалаў, якія падчас вулічных боек з паліцыяй хавалі свой твар за матацыклетнымі шлемамі ці хусткамі.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### КАЗАХСТАН. СЕРЫЯЛ ПРА ДЗЯЦІНСТВА НАЗАРБАЕВА

Пад Алма-Атой пачаліся здымкі фільма пад назвай «Неба майго дзяцінства», які распавядае пра дзяцінства прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева. Па інфармацыі мясцовых СМІ, Нурсултана ў фільме будзе іграць пяцігадовы Нурдаўлет. Адмыслова для здымак фільма Нурдаўлет вучыўся скакаць на кані, асвойваў урокі тэатральнага майстэрства. Яго настаўнік — акцёр Паўднёва-Казахстанскага абласнога драматычнага тэатра Мухан Шакіраў — адзначае неверагодную харызму і талент хлопчыка і прадказвае яму вялікую акцёрскую будучыню. Прэм'ера фільма чакаецца 6 ліпеня — да 70-годдзя казахскага лідэра.

**Па матэрыялах казахскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ГЮЛЬЧАТАЙ ЗАКРЫВАЕ ТВАР



Як піша еўрапейская прэса, французскіх дзяўчынак-тынэйджэраў з мусульманскіх сем'яў ахапіла дзіўная мода. Яны носяць параджу. З аднаго боку, гэта пратэст супраць курсу цяперашняга правага ўраду і прэзідэнта Сарказі. З іншага — своеасаблівая праява жаночага пратэсту і абарона права на індывідуальнасць. Прэса дыскутуе, як доўга працягнецца гэта мода на параджу і ці мае пратэст сацыяльную аснову. Між тым, большасць жаночых арганізацый, у тым ліку арабскіх, ухвалілі забарону параджы. Цікава, што ідэю Сарказі падтрымала таксама большасць мужчын-мусульман. Увогуле, у Францыі зараз пражывае прыкладна 5–6 мільёнаў мусульман. Адпаведна статыстыцы, параджу носяць амаль 2 тысячы мусульманак.

**Па матэрыялах «The Guardian» (Вялікабрытанія)**

### ЗША. АБОРТЫ І АМЕРЫКАНСКІ ФУТБОЛ

Скандал, ды яшчэ які. Прычым там, дзе быццам усё больш-менш палітычна нейтральна. Гаворка пра амерыканскі футбол, а канкрэтна пра фінальны матч за Суперкубак. Superbowl — гэта самае славутае спартовае шоу ў Злучаных Штатах. Кожны год у лютым пераможцы дзвюх самых вялікіх футбольных лігаў змагаюцца за згаданы прыз. За падзеяй сочыць уся Амерыка. У гэтым годзе на полі сустрэнуцца гульцы з клубу «Saints» (Новы Арлеан) і «Colts» (Індыянапаліс). Здавалася, усё было добра. Але канал CBS, які мае правы на трансляцыю, пагадзіўся рэкламаваць падчас матчу кампанію супраць абортаў. Яе замовіла кансерватыўная асацыяцыя Focus on the Family. Тэма абортаў падзяляе амерыканцаў. Па апытаннях, адна палова насельніцтва падтрымлівае правы жанчын на аборты, другая — не. Адпаведна, рашэнне CBS выклікала пратэсты. Асабліва актыўна пратэстуюць феміністычныя арганізацыі. Такая пазіцыя мела свае камерцыйныя наступствы для студыі. Упершыню за 23 гады ставіць рэкламу падчас трансляцыі Superbowl адмовілася кампанія Pepsi. Pepsi, як вядома, арыентуецца на моладзь, большасць з якой прытрымліваецца ліберальных поглядаў на аборты.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### ІТАЛІЯ. ПОРНАІНДУСТРЫЯ РЫХТУЕ АДКАЗ «АВАТАРУ»

Вядомы італьянскі рэжысёр Цінта Брас, які спецыялізуецца на эратычных фільмах (гэта ён, дарэчы, зняў «Калігулу»), заявіў, што рыхтуе годны адказ на «Аватар». Рэжысёр збіраецца выпусціць на экраны парнаграфічны фільм у фармаце 3D. Брас, якому 78 гадоў, заявіў, што цяпер самы зручны час, каб эксперыментаваць у згаданым фармаце. Ён таксама выказаў спадзяванне, што ягоны фільм стане прадметам гонару італьянцаў, паколькі гэта будзе першы італьянскі 3D фільм. Цікава, што Брас збіраецца перазняць «Калігулу», якога зрабіў у 1979 годзе. Па яго словах, з-за цэнзуры з Галівуду, кіно, зрэшты, і замовіў яму карціну, шмат чаго давялося выразаць. Дарэчы, нават пасля той самай галівудскай «цэнзуры» фільм шмат дзе забаранілі, напрыклад, у Вялікабрытаніі. Так ці інакш, Брас абвясціў, што здымкі новага «Калігулы» ў 3D пачнуцца ў чэрвені.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

ЦІКАВА



# ЦІ ПАТРЭБНЫ НАМ ТАКІ ГРУНВАЛЬД

**Алег ПЯТРОЎ**

**У гэтым годзе святкуецца 600-годзе бітвы пад Грунвальдам. Польская ліберальная і левая прэса заклікае пераглядзець стаўленне да гэтай падзеі.**

Шматлікія нацыяналістычныя канцэпцыі будуюцца на створаных у XIX стагоддзі (час нараджэння паняцця «нацыя») міфах пра гераічныя бітвы продкаў. У палякаў гэта, відавочна, Грунвальдская бітва, калі ў 1410 годзе аб'яднанае войска Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага разбіла тэўтонаў.

Міф пра Грунвальд быў адным з галоўным чыннікаў мабілізацыі польскага народа, асабліва ў часы, калі Польшча была пазбаўлена дзяржаўнасці. Святкаванні па ўсяму свету 500-й гадавіны Грунвальда ў 1910 годзе сталі яскравай маніфестацыяй актуальнасці польскага пытання і намераў палякаў вярнуць дзяржаўнасць і незалежнасць. Усім вядома гісторыя з карцінай Яна Матэйкі «Грунвальдская бітва» (1878), якую гітлераўцы доўга, але марна шукалі падчас акупацыі Польшчы. Польскія патрыёты схавалі палатно, разумеючы сімвалічную сілу твора.

Аднак ці патрэбны цяперашняй дэмакратычнай Польшчы стары міф пра Грунвальд як сімвал супраціву нямецкай экспансіі? Польская левая і ліберальная прэса ўсё часцей спрабуюць глядзець на Грунвальд больш комплексна, у кантэксце тагачаснай гісторыі ўсёй Еўропы. Прапануюцца новыя падыходы і трактоўкі той падзеі.

Каб зразумець цяперашнюю неадэкватнасць нацыяналістычных міфаў XIX стагоддзя, трэба згадаць іншую бітву. Маю на ўвазе бітву ў Тэўтабургскім лесе, тысячную гадавіну якой Германія святкавала ў мінулым годзе.

Нагадаем, што ў 9 годзе нашай эры плямёны старажытных германцаў атакавалі тры рымскія легіёны. У выніку націск Рыму на поўнач быў спынены. Гэта бітва займае ў гістарычнай памяці немцаў не меншае месца, чым Грунвальд у палякаў. Культ бітвы ў Тэўтабургскім лесе ўзнік у пачатку XIX стагоддзя, калі Германія была акупавана Напалеонам. Пра яе шмат згадвалі падчас працэсу аб'яднання Германіі, якому супрацьстаяла Францыя. Нарэшце, са спасылкай на тую бітву Бісмарк праводзіў напрыканцы XIX стагоддзя антыкаталіцкую кампанію, так званы «Культуркампф».

І вось прыйшоў тысячагадовы юбілей. Нечакана для сябе немцы канстатавалі, што міф пра тую бітву састарэў і сёння абсалютна не патрэбны. Аказалася, што былыя нацыяналістычныя інтэрпрэтацыі нелагічныя. Відавочна, што перамога над легіёнамі не мела ніякага стратэгічнага значэння для германцаў. Тое, што не змагла зрабіць рымская зброя, зрабілі хрысціянскія місіянеры. Больш таго, дзякуючы прыходу рымлян і ўключэнню рэгіёна ў кола агульнай еўрапейскай культуры, у Германіі з'явіліся першыя навуковыя ўстановы, гарады і г.д.

Ну а калі заглыбіцца ў даследаванне бітвы ў Тэўтабургскім лесе, сітуацыя выглядае яшчэ больш цікавай. Як высвятляюць гісторыкі, пераможцы бітвы ў Тэўтабургскім лесе ў хуткім часе дружна сталі калабарантамі. Адзін з сыноў лідэра германцаў увогуле зрабіў кар'еру рымскага сенатара. Іншыя правадыры германскіх кланаў праз нейкі час папросту пагадзіліся за розныя бонусы несці ахову паўночных кардонаў Рыму.

Гадавіна бітвы ў Тэўтабургскім лесе стала дэманстрацыяй неадэкватнасці старых догмаў, неадпаведнасці іх цяперашняму часу, духу інтэграцыі народаў ЕС. Палітыкі і гісторыкі ФРГ не маглі прайсці побач з круглай датай, аднак надаць ёй нейкае актуальнае гучанне так і не здолелі. Адзіныя, хто актыўна эксплуатаваў тэму бітвы, — правыя нямецкія радыкалы. Для іх тая бітва і зараз актуальная. Толькі змагацца трэба не з рымлянамі, а амерыканскай масавай культурай і эмігрантамі.

Ці не чакае падобны лёс Грунвальд? Цалкам магчыма, з улікам пэўных абставін. Па-першае, тэма кампенсацый выгнаным у 1945 годзе з Польшчы немцам працягвае заставацца актуальнай. Па-другое, у наступным годзе ў Польшчы пройдуць выбары прэзідэнта. Зрабіць піяр на Грунвальдзе вельмі прывабна. Дарэчы, правыя партыі ў 2005 годзе ўжо выкарыстоўвалі элементы міфу пра Грунвальд падчас сваёй кампаніі.

Праўда, нічога новага яны не прыдумалі. Яшчэ ў 1960 годзе ў сацыялістычнай Польшчы мела месца вялікая прапагандысцкая кампанія ў абарону новых усходніх межаў Польшчы з праекцыяй на юбілей Грунвальда.

Між тым, калі разглядаць бітву 1410 года комплексна, яна выглядае далёка не так, як у вядомым рамане Генрыха Сянкевіча «Крыжакі». Перш за ўсё канфлікт Мальбарка, Кракава і Вільні не быў этнічным або цывілізацыйным. Дастаткова згадаць, што ў самой Польшчы, як правіла, жыхарамі гарадоў былі немцы. Нават у Кракаве — сталіцы Польшчы — размаўлялі па-нямецку.

**Па падліках гісторыкаў, на грунвальдскім полі ў войску Ордэна саміх немцаў было не больш за 500 чалавек. Іншыя — паспалітае рушэнне з Памор'я, дзе на той час жылі пераважна палякі. А ў стане палякаў было шмат немцаў з Малой Польшчы**

Бытавая і правая культура ў гарадах была падобнай.

На падліках гісторыкаў, на грунвальдскім полі ў войску Ордэна саміх немцаў было не больш за 500 чалавек. Іншыя — паспалітае рушэнне з Памор'я, дзе на той час жылі пераважна палякі. У сваю чаргу, у стане палякаў было шмат немцаў з Малой Польшчы. Найбольш радыкальныя рэвізіяністы Грунвальда ўвогуле задаюць пытанне, ці не трэба рэабілітаваць Конрада Мазавецкага, які запрасіў Тэўтонскі ордэн на польскія землі? На іх думку, альтэрнатывай саюзу з немцамі быў бы рост уплыву на палякаў паганскай культуры балтаў.

Канцэпцыі публіцыстаў, якія заклікаюць пераглядзець міф пра Грунвальд, пакуль дастаткова слабыя і патрабуюць больш аргументаў. Яны звычайна прапануюць разглядаць бітву як нейкі перыферыйны еўрапейскі феадальны канфлікт. Аднак стары нацыяналістычны польскі міф пра Грунвальд, відавочна, таксама кепска пасуе еўрапейскай павестцы дня XXI стагоддзя.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

КАМЕНТАР

# ШЫРОКАЯ АЎТАНОМІЯ? ДЗЯКУЙ, НЕ ТРЭБА

**10 студзеня жыхары двух французскіх заморскіх дэпартаментаў Марцініка і Гвіяна прагаласавалі супраць пашырэння аўтаноміі. Пра дзівосныя завіхрэнні французскага посткаланіялізму журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з французскім калегай Бярнардам Шмідтам, які нядаўна пабываў на Марцініцы.**




**Даведка**

Марцініка — востраў у цэнтральнай частцы архіпелага Малыя Антыльскія астравы, які размешчаны ў Карыбскім моры. Адміністрацыйна з'яўляецца заморскай тэрыторыяй Францыі. Галоўным чынам на востраве жывуць нашчадкі былых рабоў з Афрыкі і крэолы.

***— Сыходзячы з рэалій постсавецкай палітыкі, выбар жыхароў Марцінікі падаецца вельмі дзіўным. Статус шырокай аўтаноміі, як паказвае прыклад тых жа былых аўтаномных савецкіх рэспублік, дае большыя магчымасці для мясцовай палітычнай эліты.***

— Здавалася, так яно і павінна быць. Існуе вялікая этнічная і культурная розніца паміж чарнаскурымі жыхарамі вострава і жыхарамі метраполіі. Што, дарэчы, выклікае эфект мяккай дыскрымінацыі: тубыльцам цяжка зрабіць кар'еру, іх неахвотна бяруць на працу. Эканамічныя і спажывецкія стандарты на французскіх Карыбах вельмі далёкія ад Францыі. Мясцовыя прафсаюзы на той жа Марцініцы мараць, каб мінімальны заробак складаў 350 еўра. У Францыі гэта нават не грошы. Нарэшце, на востраве даўно існуе, у адрозненні ад Гвіяны, незалежніцкі рух. Прычым ёсць незалежніцкія партыі як крэолаў, так і чарнаскурых. І нават больш таго: на мясцовых выбарах 2008 года Рух за незалежнасць Марцінікі (ММІ) упершыню прарваўся ў органы ўлады. У некаторых раёнах за яго галасавала каля 40 працэнтаў. Тым больш дзіўнымі здаюцца вынікі галасавання: супраць пашырэння аўтаномных правоў прагаласавала прыкладна 79 працэнтаў. Прычым яўка была дастаткова высокая — каля 70 працэнтаў. Можна казаць, што гэта свядомы выбар большасці.

***— Які галоўны матыў такога выбару?***

— Каб зразумець, чаму большасць прагаласавала супраць пашырэння аўтаноміі, трэба вярнуцца ў мінулы год. Дакладней, прыгадаць вясну 2009 года, калі Марцініку ахапіла агульная забастоўка, арганізаваная прафсаюзамі. Удзельнікі таксама пратэставалі супраць прывязкі эканомікі вострава выключна да французскага рынку. Больш таго, ён знаходзіцца ў руках клану нашчадкаў белых каланізатараў. «Тушыць пажар» з Парыжу прыехаў асабіста прэзідэнт Сарказі. Менавіта ў час візіту ён прапанаваў жыхарам Марцінікі больш эканамічнай самастойнасці і абвясціў пра будучы рэферэндум. Хаця на самай справе палеміка пра статус Марцінікі ідзе вельмі даўно. Зараз Марцініка — заморскі рэгіён. Статус быў прысвоены ў 2003 годзе. У кожным падобным заморскім рэгіёне дзейнічае выбарная рэгіянальная рада. Гэтыя рэгіёны дэлегуюць сваіх прадстаўнікоў у агульнанацыянальныя структуры — Нацыянальную асамблею, якая, аднак, кіруюцца спецыяльным прэфектам з Парыжа. Праўда, некаторыя законы метраполіі тут не дзейнічаюць. Такая сітуацыя даўно не задавальняе як прыхільнікаў незалежнасці, так і так званых «асімілістаў», якія хацелі б бачыць Марцініку звычайным французскім дэпартаментам.

***— Як рэагавалі на ідэю Сарказі мясцовыя партыі і палітычныя рухі?***

— У большасці крытычна. Схема Сарказі, у двух словах, была наступная: адміністрацыя Марцінікі атрымлівае больш гаспадарчых праў. У сваю чаргу, Парыж скарачае фінансавыя датацыі востраву. Пры гэтым праект не прадугледжваў ані змены палітычнай структуры, ані памяншэння палітычнай залежнасці ад Парыжа. Сарказі ўвогуле радыкальна выключыў магчымасць незалежнасці для Марцінікі. Такім чынам, мясцовыя нацыяналісты пабачылі ў праекце Сарказі папросту спробу перакласці на востраў эканамічную адказнасць і заклікалі галасаваць супраць.

**«Тушыць пажар» з Парыжу прыехаў асабіста прэзідэнт Сарказі. Менавіта ў час візіту ён прапанаваў жыхарам Марцінікі больш эканамічнай самастойнасці і абвясціў пра будучы рэферэндум**

***— Як рэагавалі ў Францыі на праект Сарказі і вынікі рэферэндуму?***

— Правыя партыі, кшталту Нацыянальнага Фронту, і частка галістаў выступілі радыкальна супраць пашырэння аўтаноміі. Яны пабачылі ў гэтым замах на інстытуты французскай рэспублікі, для якой характэрны моцны цэнтралізм і універсальнасць праў для кожнага грамадзяніна. Хаця існуюць рэгіёны-выключэнні. Маю на ўвазе так званы regime de la specialite legislative. Такі рэжым дзейнічае на некаторых тэрыторыях. Тут мясцовыя органы ўлады маюць права прымаць канчатковае рашэнне па падпісаных у Парыжы законах. Такім правам карыстаюцца некалькі астравоў у Палінезіі. Менавіта такую форму шырокай аўтаноміі хочуць аўтанамісты і прыхільнікі незалежнасці. Што тычыцца французскіх левых, то яны былі цалкам на баку праціўнікаў Сарказі. Па большасці іх праблема незалежнасці не цікавіла. Іх цікавіў страйк, у якім яны бачылі правобраз будучых класавых бітваў у Францыі, прыклад таго, як трэба дзейнічаць. Падчас забастоўкі востраў наведалі амаль усе лідэры французскіх левых.

***— Рэферэндум праваліўся. Што далей?***

— Сацыяльныя супярэчнасці на Марцініцы застаюцца не вырашанымі, таму канфлікт на востраве будзе працягвацца. Шмат што зараз будзе залежыць ад вынікаў забастоўкі на суседнім востраве Гвадэлупа, які таксама належыць Францыі. Напрыканцы студзеня там пачалася забастоўка. Калі яна перакінецца на Марцініку, магчыма, тэма неабходнасці змены статусу вострава зноў усплыве.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### БАРЫС ФОКША



Міністр культуры Малдовы і яго ведамства абвясцілі пра конкурс праектаў помніка «Манумент Свабоды», які будзе ўсталяваны перад уваходам у будынак парламента. Увогуле, манумент будзе прысвечаны красавіцкім падзеям мінулага года. Тады, нагадаем, моладзь і студэнты, пратэстуючы супраць перамогі Кампартыі на парламенцкіх выбарах, арганізавалі масавыя акцыі ў цэнтры малдаўскай сталіцы. Іх вынікам сталі захоп і разгром будынку парламента. Камуністы, якія тады кіравалі краінай, пратэст падавілі, аднак утрымацца пры ўладзе не здолелі. Увосень да ўлады прыйшла кааліцыя дэмакратаў, якія трактуюць падзеі ў красавіку не як мяцеж на замову румынскіх спецслужб, а народны пратэст, пралог дэмакратычнай перамогі. Адсюль і ўзнікла ідэя «Манумента Свабоды». Конкурс толькі абвешчаны, аднак ужо зараз зразумела, што спрэчак вакол яго будзе шмат. Справа ў тым, што студэнты падчас тых падзей 2009 года знішчылі арыгінал дэкларацыі незалежнасці Малдовы, патрабуючы далучэння Малдовы да Румыніі. Ці можа малдаўская ўлада ставіць манумент людзям, які хацелі пазбавіць краіну суверэнітэту? Менавіта з такіх пазіцыяй крытыкуюць ідэю помніка камуністы-апазіцыянеры. Яны патрабуюць паставіць помнік не свабодзе, а незалежнасці Малдовы.

### ЭВА МАРАЛЕС



Прэзідэнт Балівіі, вядомы сваімі радыкальнымі левымі поглядамі, апошнім часам зацікавіўся пытаннем глабальнага пацяплення. Прычым настолькі моцна, што на днях абвясціў пра правядзенне ў балівійскім горадзе Качабамба «Сусветнай канферэнцыі народаў супраць кліматычных змен і за Маці-зямлю». Канферэнцыя павінна адбыцца ў красавіку. Кіёцкі працэс, як паказалі падзеі ў Капенгагене, сапраўды знаходзіцца ў крызісе якраз з-за пазіцыі багатых краін. Таму прапанова Маралеса сапраўды атрымала рэзананс. Сам прэзідэнт Балівіі мае тут шмат амбіцый. У Качабамбе сярод іншага будзе абмяркоўвацца ідэя правядзення сусветнага рэферэндуму па пытанню глабальнага пацяплення. Мяркуецца, што на плебісцыт вынесуць пытанне пра скарачэнне выкідаў газаў у атмасферу і пра неабходнасць кампенсацый народам краін Трэцяга свету з боку развітой Поўначы за эксплуатацыю іх прыродных багаццяў. Само апытанне быццам пройдзе дзякуючы актывістамі грамадзянскіх арганізацый. Наколькі рэальна такая глабальная акцыя, цяжка сказаць. Многія арганізацыі і нават урады заявілі пра свой удзел у канферэнцыі. У той жа час многія адмовіліся ад удзелу, асцерагаючыся, што балівійцы не змогуць забяспечыць добрую арганізацыю канферэнцыі. Прынамсі сайт канферэнцыі сапраўды працуе абы-як.

### НІК ГРЫФІН



Лідэр правай Брытанскай нацыянальнай партыі (BNP) і так мае дрэннае рэнаме сярод мясцовых інтэлігентаў. Дастаткова згадаць гісторыю, калі нацыяналісты паспрабавалі весці кампанію супраць польскіх эмігрантаў, надрукаваўшы плакат з выявай самалёта, на якім у 1940-я гады польскія лётчыкі змагаліся за Англію супраць фашыстаў. Цяпер Нік заявіў, што з'яўляецца фанатам народнай англійскай музыкі. Тут і пачалося. Шматлікія музыкі, якія граюць народныя творы, пачалі дружна рабіць заявы, што народная музыка і брытанскі нацыяналізм — абсалютна розныя рэчы. Яны спасылаюцца пры гэтым на той факт, што вялікі ўклад у падтрымку народных музычных традыцый англічан у свой час адыгралі цыгане, якіх так ненавідзіць партыя Грыфіна. У любым выпадку, гісторыя мела цікавы фінал. Па ініцыятыве аднаго з выканаўцаў фолк-музыкі вырашылі стварыць рух «Фолк супраць расізму». Гэта рымейк славутай кампаніі 1970-х гадоў, калі ў адказ на актывізацыю расістаў тагачасныя вядомыя музыкі заснавалі рух «Рок супраць расізму».

▸ ПОСТАЦІ

# СЛОВА ПРА БРАТОЎ ГАРЭЦКІХ

Арсень ЛІС

**Браты Гарэцкія належаць да залатога пакалення беларускай інтэлігенцыі, што насуперак неспрыяльным, часам фатальным, умовам здолела многа і годна папрацаваць для духоўнага спасціжэння Беларусі, сцвярджэння яе як суверэннай этнічнай адзінкі ў агульналюдскай супольнасці. Належалі яны да пакалення, якое надзейна абаперлася на грунт, падрыхтаваны «Нашай нівай» з яе праграмай «будзіць у беларуса пачуццё чалавека і грамадзяніна», арыентацыяй на дэмакратычны шлях развіцця маладой, паўсталай да свядомага грамадскага жыцця нацыі.**


www.znichka.ucoz.com

Максім Гарэцкі


www.nn.by

Гаўрыла Гарэцкі. Мінская турма, 1930 г.




«Твой, Беларусь, пачаўся Рэнесанс цяпер, // Хто ведае, што створыць твой народ!» — так, аглядаючыся на вяршыні высокага еўрапейскага Адраджэння XV–XVI стагоддзяў, марыў-распавядаў адзін з дойлідаў беларускага тэатра Францішак Аляхновіч.

«Ахвярую сваім «я» дзеля святога для ўсіх нас Адраджэння», — скажа Максім Гарэцкі, які як пісьменнік дэбютаваў у «Нашай ніве». Скажа запаветнае пасля таго, як выйдуць зборнік яго апавяданняў «Рунь», аповесць «Дзве душы», «Гісторыя беларускай літаратуры», адзначаная канцэптуальным поглядам на станаўленне беларускага прыгожага пісьменства.

Гаўрыла Гарэцкі пад духоўным уплывам старэйшага за яго на сем год брата Максіма таксама марыць пра адраджэнне бацькаўшчыны — Беларусі. Але перадусім пра гаспадарчае, эканамічнае яе адраджэнне.

Студэнтам Пятроўскай (Ціміразеўскай) сельгасакадэміі ён гуртуе землякоў у Беларускай культурна-навуковай асацыяцыі студэнтаў (налічвала 175 чалавек), плануе пакрыць Беларусь навукова-даследчымі станцыямі для раскрыцця яе прыродных вытворчых сіл.

14 лістапада 1921 года на ўгодкі Асацыяцыі ў прысутнасці старшыні ЦВК А. Р. Чарвякова Гаўрыла Гарэцкі робіць даклад «Вывучэнне Беларусі як фактар яе адраджэння». У часопісе «Маладая Беларусь» Гарэцкі цвердзіць: «Беларускі народ гэтак зачакаўся паляпшэння свайго эканамічнага дабрабыту, што ён гарою пойдзе за ідэямі інтэгральнага рэнесансу беларускага, падмуркам якога можа з'яўляцца найперш адраджэнне эканамічнае. У адроджанай эканамічнай Беларусі закрасуюць мастацтва, навука, закрасуецца беларуская мова... Дзеля стварэння эканамічнага фундаменту Беларусі патрэбна свая родная, тэхнічная і усялякая іншая інтэлігенцыя. Стварыць гэтую новую інтэлігенцыю і ёсць заданне маладых беларусаў».

У гэты ж час у адным з лістоў ён піша: «Моцна толькі тое, што здабываецца барацьбою. Хочам жыць, тварыць. Дось енкаў, дось слоў, мы хочам даць працу, мы маем рэальную мэту: праз 20–25 гадоў пераўтварыць Беларусь у Данію».

З восені 1925 года Гаўрыла Гарэцкі — у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. У акадэміі, за якую ўжо паспеў пазмагацца ў друку і ў калідорах улады, у сценах самой навучальнай установы. Гэтым часам малады вучоны стварае некалькі вельмі актуальных у кантэксце станаўлення Савецкай Беларусі прац па эканоміцы і дэмаграфіі.

У манаграфіі «Народны прыбытак Беларусі» на базе велізарнага статыстычнага матэрыялу даследуе крыніцы нацыянальнага даходу рэспублікі, аналізуе ўсе галіны яе гаспадаркі, высвятляючы перспектывы іх развіцця на будучыню.

У манаграфічным даследаванні «Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы (Нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі)» на падставе аналізу некалькіх перапісаў жыхароў краю доказна даводзіць этнічна беларускую тоеснасць насельнікаў заходнебеларускіх земляў, што ў абставінах арыентацыі кіраўнікоў Польшчы на паланізацыю набывае вострыя палітычны сэнс.

Навукова-практычную скіраванасць мелі і дзве значныя публікацыі Гаўрылы Гарэцкага, прысвечаныя гаспадарцы і дэмаграфіі Гомельшчыны, якая якраз у парадку пастановы савецкай улады аб узбуйненні БССР, штучна адлучаная ў 1919 годзе, далучалася да Савецкай Беларусі.

Праца Гаўрылы Гарэцкага была высока ацэнена навуковай грамадскасцю і ўрадам рэспублікі: пры заснаванні Беларускай акадэміі навук ён быў абраны яе правадзейным членам — акадэмікам.

1930 год паклаў жорсткую мяжу ў жыцці беларускай інтэлігенцыі, ды і асноўнай масы народа, перадусім, сялянства.

Двойчы прыгавораны да расстрэлу, Гаўрыла Гарэцкі жыццёвую драму сваю перанёс стойка. Арышт і турма, высылка, праўда, прымусілі адмовіцца ад абранай у маладосці любімай эканамічнай геаграфіі. Давялося засвоіць (і здзейснілася тое з любоўю) новую прафесію — геалогію, навуку аб Зямлі. Геалогія антрапагена стала яго лёсам.

Будучы зняволеным на пабудове Беламора-Балтыйскага канала, геолага-вышуковых работах на рэках Кольскага паўвострава і пазней ужо вольным пры інжынерна-геалагічным абследаванні Камы, Волгі, Дняпра, сабраў вялізны матэрыял аб геалагічных адкладах гэтых рэк і далін, фарміраванні іх басейнаў.

У 1960–1980-х гадах тэарэтычна асэнсаваў, абагульніў яго ў фундаментальных манаграфічных выданнях «Аллювий великих антропогеновых прарек Русской равнины» (1964), «Формирование долин Волги в раннем и среднем антропогене» (1966), «Аллювиальная летопись Великого Пра-Днепра» (1970), узнагароджаных Дзяржаўнай прэміяй СССР.

Праз 37 гадоў, ужо прызнаным геолагам чацвярцічнага, або антрапагенавага, перыяду Зямлі, Гаўрыла Гарэцкі здзейсніў мару ўсяго свайго жыцця — вярнуўся на Беларусь, каб паслужыць непасрэдна ёй. Акадэмік К. І. Лукашоў (дарэчы, таксама родам з Мсціслаўшчыны) прызначыў Гарэцкага загадчыкам сектара палеаграфіі антрапагенавага перыяду Лабараторыі геахімічных праблем, пазней пераўтворанай у Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР, сягоння, на жаль, закрыты ў парадку рэструктурызацыі. Разам з акадэмікам Г. А. Гарэцкім да беларускіх геолагаў вярнулася як паточная, рабочая родная беларуская мова. Галоўнае ж — прыйшоў вялікі практычны і тэарэтычны вопыт даследавання алювіяльных адкладаў буйных рэк, гэтых спрадвечных артэрый цывілізацыйнай жыццядзейнасці чалавека.

Прыход Г. А. Гарэцкага ў АН БССР спрычыніўся да складвання нацыянальнай школы палеапатамалогіі. Разам з маладымі геолагамі аўтарытэтны вучоны правёў пачатае ім яшчэ раней даследаванне Нёмана, які лічыў эталонам рэк, чые басейны сфарміраваліся пад уплывам ледавіка. У геалагічным вывучэнні Нёманавай даліны бачылася знакамітаму вучонаму важнае перспектыўнае гаспадарчае значэнне: не ў апошнюю чаргу і ў аспекце адкрыццяў карысных выкапняў, што звычайна знаходзяцца ў крышталічных пародах лагчын ледавіковага выворвання.

Даследаванне рэчышча, даліны Нёмана апісана вучоным у манаграфіі «Асаблівасці палеапатамалогіі ледавіковых абласцей (на прыкладзе беларускага Панямоння)» (1980), дзе разглядалася магчымасць карэляцыі адкладаў рэк паўднёвых мораў і рэк Балтыйскага басейна. Праца, такім чынам, мела глабальны навуковы аспект.

Насуперак выклікам лёсу, зменлівай жорсткай эпосе Гаўрылу Гарэцкаму ўдалося рэалізаваць сваю дзейсную магутную натуру, высокі інтэлект.

Старэйшаму брату Максіму, расстралянаму ў 45 гадоў, свой багаты аналітычна-мастацкі талент удалося ўвасобіць у кнігах прозы, крытыкі, літаратуразнаўства толькі часткова. Але гэтага аказалася зусім дастаткова, каб рэальна стаць побач з класікамі айчыннай літаратуры. Яго ідэя — праз мастацка-аналітычнае асэнсаванне жыцця некалькіх пакаленняў суайчыннікаў паказаць гістарычны шлях беларускага народа — была пераняты другім беларускім эпікам — Кузьмой Чорным і мае працяг у сённяшніх творцаў беларускага прыгожага пісьменства.

Духоўны пачатак у родзе Гарэцкіх, занядбана-схаваны часам у глыбінях стагоддзяў, выразна абазначыўся ўжо ў песенным дары маці братоў — Ефрасінні Міхайлаўны. Падрыхтаваны Максімам Гарэцкім разам з кампазітарам Аляксандрам Ягоравым (да слова, таксама загубленым таталітарнай сістэмай) і выдадзены ў 1928 годзе Інбелкультам зборнік песень з мелодыямі Просі Гарэцкай, красамоўна засведчыў самабытны талент спявачкі, носьбіткі беларускай народна-культурнай традыцыі.

У зборніку песень Просі Гарэцкай змешчана унікальная народная балада, змест якой дзіўна накладаецца на лёс братоў Гарэцкіх:

*Ты дуброва, дуброва,*
*Дубровачка зіліная,*
*Ах і што ж ты, дуброва,*
*А ня родзіш ты нічога?*
*Ні зрадзіла дуброва*
*А ні хмелю, ні ячменю,*
*А зрадзіла дуброва*
*Густы ельнік ды бярэзнік...*
*Каб на том на ельнічку*
*Ды два брахнінькі гулялі,*
*Ды два брахнінькі гулялі,*
*Яны бруссейка цісалі,*
*Яны бруссейка цісалі,*
*Святлічаньку будавалі.*
*Яны думалі — святліца,*
*Ажну цёмная цямніца...*
*— Вот цяперэка мы, браціц,*
*Навек з табой запрапалі.*
*А й ня будзім, браціц, знаці,*
*Калі зіма, калі лета;*
*А й ня будзім, браціц, знаці,*
*Калі дзянёк, калі ночка;*
*А й ня будзім, браціц, знаці,*
*Калі свят дзень, калі будні...*

І ўсё ж... І гэта знак беларускай трываласці, аднача і надзеі: духоўны патэнцыял роду Гарэцкіх не вычарпаны. Не знайшоўшы працягу ў сыне Максіма, які, як і бацька, загінуў трагічна, праўда, не ў турме, а на фронце, інтэлектуальная традыцыя сям'і Гарэцкіх сёння працягваецца працай сыноў Гаўрыла Іванавіча — філолага Усяслава і акадэміка-геолага Радзіма.

Мастацкая і навуковая спадчына братоў Гарэцкіх знайшла і знаходзіць адэкватнае навукова-тэарэтычнае асэнсаванне ў працах навукоўцаў, перадусім гуманітарыяў. Перш-наперш у даследаваннях манаграфічнага характару А. Адамовіча, Зм. Бугаева, М. Мушынскага, Т. Голуб.

Важкі том мемуараў пра Гаўрылу Гарэцкага ўбачыў свет на пачатку новага стагоддзя. А сёння чытач атрымаў сапраўдны эпас жыцця і пакут беларускай інтэлігенцыі, складзены Радзімам Гаўрылавічам Гарэцкім пад назвай «Браты Гарэцкія».

Няма сумневу, што спадчына Гарэцкіх, мастацкая і навукова-аналітычная, застанецца запатрабаванай і наступнымі пакаленнямі беларусаў, бо заключае ў сабе энергію і інтэлектуальны патэнцыял волатаў духу свайго народа.

СПАДЧЫНА

# ПАСЕЧАНАЯ ДЫНАСТЫЯ

Кастусь ТАРАСАЎ

**У гістарычнай навуцы за Войшалкам усталявалася слава прадаўжальніка справы Міндоўга, забітага князем Даўмонтам. І сам Войшалк быў забіты ўладзімірскім князем Львом. Бацька і сын на вяршыні ўлады сталі ахвярамі замаху на жыццё.**


Князь Войшалк


Князь Міндоўг

## Бацька і сын

Імя Міндоўга з'яўляецца ў летапісе пад 1219 годам. Ён — вядомы ўдзельнік разгрому тэўтонцаў у 1237 годзе ў бітве пад Драгічынам. У 1248 годзе Міндоўга запрасіў сваім князем Навагрэдак. Князь Галіцкай Русі Даніла, бачачы ў ім суперніка, аб'яднаўся з немцамі і яцвягамі і пайшоў на яго вайной.

Ад першага шлюбу ў Міндоўга былі дачка і сын Войшалк. Дзеля замірэння з князем Данілам ён выдаў сваю дачку за яго сына Сварарміра (кароткая форма — Шварн), а Войшалка быў змушаны пакінуць у Данілы закладнікам. Войшалк, паселены ў Паланецкім манастыры пад нагляд манахаў, прыняў праваслаўе і паверыў так моцна, што прыняў пострыг, а калі вярнуўся на радзіму, стаў ігуменам манастыра на Нёмане.

Пашыраючы межы Наваградскай дзяржавы, Міндоўг адымаў удзелы ў пляменнікаў Таўцівіла і Ердзівіда. Яшчэ аднаго пляменніка Трайняту ён паставіў сваім намеснікам у Жмудзі. Міндоўг забіў правіцеля суседняга з Наваградкам княства Відымунта, а яго зямлі і жонку ўзяў сабе. У гэтым шлюбе ў яго нарадзіліся два сына — Рукля і Рэпік. Дзеля міру з Лівонскім ордэнам, Міндоўг, а разам з ім і сям'я, у 1252 годзе перайшлі ў каталіцтва, жонка прыняла імя Марты, Рукля — Генрых, Рэпіка называюць Андрэем.

Але ў 1259 годзе князь скасоўвае сяброўства з Ордэнам, выганяе з Наваградскіх земляў нямецкіх манахаў і вяртаецца да дзедаўскай веры. Міндоўг праводзіць паход на Мазоўшу, захоплівае князёў Земавіта і Конрада, спальвае Плоцк і Варшаву, але раптоўная смерць Марты ў 1262 годзе пакідае князя ўдаўцом.

## Яр і помста

На пахаванні Марты прыбывае з Нальшы яе сястра, былая замужам за князем Даўмонтам. Убачыўшы сваячку, Міндоўг запаліўся ярам і на памінках абвясціў, што пакідае яе сваёй жонкай, каб дзеці апынуліся ў родных руках. Уласнымі рукамі ён завязаў вузел трагедыі. Жанчына, у якой быў малады муж, мусіла застацца з 65-гадовы князем.

Даўмонт зганьбаваны. Пляму ганьбы можна змыць толькі крывёй крыўдзіцеля. У дружыне Даўмонта — 300 ваяроў. Але адпомсціць князю Міндоўгу, якому падпарадкавана ўся моц Наваградскага княства, такой дружынай у адкрытым супрацьстаянні было немагчыма. І Даўмонт заклікаў у саюзнікі пляменніка Міндоўга, князя Трайняту, які жадаў заняць месца дзядзькі, а таксама радцу Міндоўга, князя Астапа, бацька якога збег з Рязанскага княства пасля забойства некалькіх сваякоў. Даўмонт, які выступіў супраць Міндоўга па прыватных матывах, асвятляецца ў нашай літаратуры змрочнай лексікай — забойца, якога скарысталі змоўшчыкі. Быццам прычыны прыватнай помсты менш паважаныя, чым імкненне да крыўднага гвалту.

5 жніўня 1263 года Даўмонт і Трайната нечакана нападаюць на Міндоўга. У гэтай сутычцы Даўмонт сякерай пасек Міндоўга, як гавораць летапісы, «у капусту». А ўсіх, хто былі пры ім — Руклю і Рэпіка, новую жонку, блізкіх яму баяраў, — забіла дружына.

Ігумен Войшалк збег у Пінск у Лешчанскі манастыр.

## Ваенная дапамога

Ад усіх гарадоў Міндоўга, дружыны, срэбра і золата не засталося Войшалку нічога — толькі рыза ды конь, на якім ён выратаваўся ад пагоні. Адзінае, чым яшчэ ён валодаў, была спадчына на ўладу вялікага князя Наваградка і Літвы. Але для гэтага трэба падперазацца мячом, сабраць полк, без разбору забіваць. Пінскі князь Георгій згадзіўся даць сваіх кметаў за абяцанне літоўскага сяброўства, прыязджаў швагер Шварн абгаварыць умовы сваёй падтрымкі, і на подступах лета Войшалк аддаў загад «зацягваць у Навагрудку сіло».

Месца забітага Міндоўга заняў у замку князь Трайната, перавёз сюды жонку, двор, слуг. Праз пяць месяцаў да Трайнаты прыехаў з Полацка стрыечны брат Таўцівіл — «дзяліць спадчыну па Міндоўгу». Дзяльба скончылася тым, што Трайната ўвагнаў брату ў горла нож, хоць гэты нож павінен быў усадзіць у грудзі Трайнату князь Таўцівіл, як гэта было дамоўлена з ім Войшалкам.

Шукаць новых выканаўцаў давялося надоўга — пагадзіліся чацвёра стайнікаў Міндоўга. У іх сіло Трайната патрапіў у майскі дзень, калі адправіўся парыцца ў лазенку. Раптам у апарню ўвайшлі чацвёра. Трайната звярнуў да іх твар, пазнаў і толькі ўскрыкнуў, калі ў яго спіну ўсадзіліся чатыры нажы…

Нарэшце Войшалк увайшоў у замак. Перш за ўсё ён загадаў караць разанца Астапа і даставіць да яго Даўмонта. Войшалку ўбачылася магільная павуціна на магіле Даўмонта, на папялішчах яго замка і дварах яго кметаў. Гэтую павуціну сплятуць мячы кметаў князя Георгія і ратнікаў Шварна. А таксама павуціну па Даўмонту разважаць яго сваяк, нальшанскі князь Гердзень, таму што аддасць яму Войшалк усе Даўмонтавы землі.

## Даўмонтаў горад

Даўмонт быў больш мудры і разам са сваёй дружынай, з усім дваром і вялізным абозам сышоў у Пскоў. «Вялікім было здзіўленне пскавічоў, калі яны даведаліся, што князь прыйшоў з просьбай прыняць яго на службу». Пскавічы параіліся і выставілі ўмовы: Пскоў прыме Даўмонта, калі князь і яго дружына прымуць праваслаўную веру. Князь даў згоду.

І паўстаў у Пскове Даўмонтаў горад, дзе жылі нальшанцы. Сваю службу для Пскова Даўмонт пачаў паходам на князя Гердзеня, які быў узвышаны і пераехаў у Полацк. Даўмонт паланіў княгіню Ефрасінню (жонку Гердзеня і сваю цётку), і сына Гердзеня, свайго пляменніка, і адвёў іх у Пскоў. Гердзень кінуўся ў пагоню адбіваць жонку, але ў сутычцы з дружынай Даўмонта загінуў. Здарылася гэта ў 1267 годзе. Ефрасіння пасля згубы мужа стала манахіняй пад імем Еўпраксія. Сын яе Андрэй пазней выбіўся ў цвярскія біскупы.

Князь Даўмонт у другім шлюбе парадніўся са старэйшым сынам Аляксандра Неўскага князем Дзмітрыем, які змагаўся з братам Андрэем за ўладзімірскі вялікакняжацкі стол. Андрэй прывёў татарскую раць на Уладзімірскую зямлю, а Дзмітрый збег у Ноўгарад. Наўгародцы падтрымалі Андрэя, паланілі жонку, дзвюх дачок Дзмітрыя і яго баяраў з сем'ямі. Бок Дзмітрыя прыняў князь Даўмонт. Было гэта ў 1282 годзе, князь Дзмітрый аддаў Даўмонту ў жонкі сваю дачку Марыю. Ёй было 15 гадоў, князю Даўмонту — за сорак.

Праз год пасля вяселля нарадзіўся сын, які атрымаў імя Давыд. Ён выхаваўся ў Пскове, навучаючыся вайсковай справе ў бацькі. Памёр Даўмонт у 1299 годзе. Вялікі князь Гедымін запрасіў Давыда ў Літву, прызначыў сваім намеснікам на Гарадзенскі ўдзел і аддаў за яго сваю дачку Біруту. Князь Давыд уславіў сваё імя як палкаводзец Вялікага княства ў бітвах з крыжакамі. Але гэта цалкам іншая гісторыя, адносін да князя Войшалку яна не мае.



Гара Міндоўга

## Зніклая дынастыя

Валынская ваенная дапамога дорага каштавала Войшалку. Ён прызнаў князя Шварна сваім суправіцелем, а потым і саступіў яму ўладу ў Навагрудку. Іншымі словамі, ён здрадзіў усёй справе свайго бацькі — створанай ім дзяржаве, яго княжай уладзе, аб'яднаным землям. Усё без клопатаў, без вайны перайшло ў рукі валынскіх суседзяў. Дзіву можна давацца, як некаторыя гісторыкі і папулярызатары беларускай дзяржаўнасці бачаць у асобе князя Войшалка вялікага дзяржаўнага мужа, які ўмацоўвае сваю краіну.

Можна зразумець расійскіх гісторыкаў, якія тлумачаць учынак Войшалка як выкананне задумы стварыць моцнае праваслаўнае Галіцка-Навагрудская княства, у якім навагрудскія землі склалі б перыферыю. Але хутчэй за ўсё ён саступіў уладу радзіне, кіруючыся асабістымі сімпатыямі, не турбуючы сябе разважаннямі пра гістарычную будучыню той дзяржавы, якую стварыў яго бацька.

У яго самога дзяцей не было, сястра яго была за Шварнам, вось Шварну і даручыў ён вышэйшую ўладу, чаго ніколі не зрабіў бы яго бацька. Паказальны і яго выбар Холмскай зямлі для манаскага жыцця — занадта яна далёка ад яго радзімы, каб весці там праваслаўнае місіянерства, што прыпісваюць яму як духоўную мэту нашы прыхільнікі праваслаўя.

Аднак не наканавана было Войшалку доўга жыць. На Вялікдзень старэйшы брат Шварна князь Леў, дужа пакрыўджаны, што ўладу ў Навагрудку атрымаў Шварн, а не ён, запрасіў Войшалка ва Уладзімір, і, бычыўшы з ім на застоллі, напіўся. «*Дьявал же, — як запісаў летапісец, — исконе не хоць добра чаловечаму роду, и вложил в сердце Львови убити Войшелка*», што той і здзейсніў.

Так загас род Міндоўга, хоць мог стагоддзі княжыць у Літве, калі б не запаліўся стары князь да чужой жонкі і не выклікаў бы змрочнай помсты Даўмонта. Ён загінуў, яго дзеці загінулі, пляменнік Ердзівіл загінуў у бітве з мазаўшанамі, сышлі з гэтага свету забітыя пляменнікі Таўцівіл і Трайната. Усе як адзін!

Мог і Войшалк княжыць і нарадзіць сына, і перадаць уладу яму. Але яму не было прызначана. Ён, апранўты ў вялікакняжацкі ўбор, насіў на галаве чорную скуфейку. Ці думаў ён, каму перадасць уладу над княствам? Верагодна, думаў — дзецям швагра Шварна.

Апыніся князь Шварн мацней здароўем, не пі ён так моцна, — невядома яшчэ, адбылося б Вялікае княства Літоўскае. Можа, яно б звалася Вялікае княства Валынскае. У 1269 годзе Шварн захварэў, перадаў завяшчаннем брату Льву свае гарады Узгорак, Чэрвень і Белз, і праз тры дня сканаў.

У княстве Навагрудскім і Літоўскім не знайшлося законнага спадчынніка, і пачалася доўгая, на чвэрць стагоддзя, межусобная вайна князёў за месца вялікага князя.

▸ АГЛЯД

# ЦІ ЯНО НАМ ТРЭБА

## ВЫДАННІ, ЯКІЯ ЗДЗІВІЛІ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Хацелася б пазнаёміць чытача з выданнямі, з'яўленне якіх у публічнай прасторы выклікала апошнім часам рэзананс у беларускага чытача — ад лёгкага непаразумення да скрайняга абурэння.**

### АДВАКАТКА КАЛОНІЙ

**Эва Томпсан. Песняры імперыі: Расійская літаратура і каланіялізм. — Мн.: Медысонт, 2009. — 382 с.**




«Ці патрэбная нам Эва Томпсан?» — такое пытанне стаяла ў загалоўку першай беларускай рэцэнзіі на кнігу вядомай амерыканскай славісткі польскага паходжання. Яе самая знакамітая праца — манаграфія «Imperial Knowledge: Russian Literature and Colonialism» (2000), прысвечаная аналізу каланіяльнага складніка рускай літаратуры, выйшла напрыканцы 2009 года ў беларускім перакладзе Тацціяны Нядбай. Як выявілася пазней, пытанне было сімптаматычным: нават аўтар гэтай даволі прыхільнай рэцэнзіі Ігар Гафараў не дэманстраваў захаплення ад навінкі навуковай думкі па-беларуску, а нібы спрабаваў апраўдаць яе з'яўленне ў вачах чытача.

«Песняры імперыі» — даследаванне, якое прыкладае (пост)каланіяльныя штудыі да літаратуры, што з'яўлялася на тэрыторыі Расійскай імперыі, СССР, Расійскай Федэрацыі ў XIX–XX стагоддзі. Працуе такі метад вельмі лёгка. Калі, напрыклад, разглядаць пры яго дапамозе раман Альбера Камю «Чума», то перад намі зусім не шэдэўр літаратуры экзістэнцыялізму, а кніга, дзеянне якой адбываецца на тэрыторыі французскай калоніі Алжыр, дзе з чумой змагаюцца адно французы-каланізатары: карэннае насельніцтва пазбаўленае гонару і годнасці, яму наканавана быць толькі масоўкай (трупамі на дне чумной ямы) вялікай літаратуры. Гэтак інтэрпрэтаваў раман Камю Эдвард Саід у сваёй кнізе «Арыенталізм» (1978). Арыентуючыся на Саіда, Томпсан разглядае рускі літаратурны канон як гімн расійскай каланіяльнай славе.

Пад раздачу трапляюць самыя розныя, што да эпох і ідэалогій, пісьменнікі суседзяў: Пушкін і Лермантаў (каланізатары Каўказа), Талстой (фальсіфікатар падзей вайны 1812 года), Салжаніцын (каланізатар Узбекістана), Распуцін і Рыбакоў (каланізатары Сібіры) і некаторыя іншыя пісьменнікі і літаратуразнаўцы. Ёсць у кнізе і станоўчыя (неімперскія) персанажы, але іх значна меней.

Эва Томпсан (у дзявоцтве Маеўска) нарадзілася ў 1937 годзе ў Вільні ў польскай сям'і. У 1945 годзе сям'я была выслана Саветамі ў Гданьск, на былыя нямецкія землі — траўма такога гвалтоўнага перасялення яднае лёсы многіх палякаў. Асабісты момант польскай крыўды на Расію адчувальны ў кнізе, хоць аўтарка спрабуе не даваць волю пачуццям.

Канфлікт паміж творам і чытачом, на першы погляд, — у простай неадпаведнасці: праз русіфікаваныя адукацыю і выхаванне мы, беларусы, не здольныя ўспрыняць рускую літаратуру як нешта шкоднае, што выціскае з нашага кругагляду ўласную нацыянальную спадчыну. Але першыя водгукі на кнігу паказалі: цалкам усведамляючы праблему ўласнай русіфікаванасці, беларускія інтэлектуалы не могуць прайсці міма заўважнай некампетэнтнасці Томпсан у рускім літаратуразнаўстве. Адукаваны беларускі чытач, як ніхто з іншых крытычна настроеных да рускага імперыялізму еўрапейцаў, ведае ворага ў твар — дзякуючы гэтай самай русіфікацыі. Абвергнуць многія з тэзісаў Томпсан можа любы беларускі школьнік — нават без спецыяльнай гуманітарнай падрыхтоўкі. Дастаткова ўмення свабодна чытаць па-руску.

Гісторык Алесь Пашкевіч, падкрэсліўшы сваю пазіцыю «простага чытача», не паленаваўся перагледзець аповесць Распуціна «Пажар» і раман Салжаніцына «Ракавы корпус» і, што называецца, злавіць даследчыцу за руку ў кепскім веданні кніг, якія яна крытыкуе. Не маўчаць і прыхільнікі гістарычнай (а не толькі літаратурнай) праўды: «Беларусу прыкра будзе чытаць частку, прысвечаную падзеям 1939 года. За ўз'яднаннем Беларусі і Украіны Томпсан бачыць толькі працяг расійскай імперскай палітыкі ў дачыненні да Польшчы. Чакаць менш перадузятага погляду не выпадала — аўтарка ў сваіх інтэрв'ю правым польскім выданням аднойчы абвясціла, што «польскі нацыяналізм — незвычайна лагодны». Прызнанне адных каланізатараў лепшымі за іншых слаба кладзецца ў пракрустаў ложак заходняга навуковага мыслення», — піша Сяргей Богдан у рэцэнзіі для «Нашай нівы».

Цікава, што ў суседняй Украіне, дзе выдавецтва «*Основи*» выдала ўкраінскі пераклад кнігі яшчэ ў 2006 годзе, дагэтуль не аціхлі захопленыя водгукі крытыкаў і пісьменнікаў. Кнігу называюць чаканай, патрэбнай, а на ўсе яе яўныя хібы рэцэнзенты заплюшчваюць вочы. Розніца паміж успрыняццем кнігі ва Украіне і Беларусі ўражвае і прымушае задумацца… Толькі вось пра што? Пра градус пасіянарнасці абодвух народаў? Пра ступень іх русіфікацыі? Ці ўсё-ткі пра скрайнюю неабходнасць украінцам і беларусам метаду, прапанаванага аўтаркай? Стваральнік інтэрнэт-паслугі «Кнігі — поштай» Алесь Яўдаха мяркуе: «Можна доўга пералічваць рэальныя недахопы працы Томпсан, але гэта першая кніга (з вядомых мне), якая асвятляе гэту праблему [каланіялізму рускай літаратуры —Е.В.]. (…) Цяпер я маю выбар — чытаць Томпсан ці не чытаць Томпсан. Я схіляюся да чытання».

### БЕСХРЫБЕТНАЕ ЧЫТВО

**«Filet» зіма 2009–2010.**




Пад самы Новы год стэнды для дармовай раздачы ў розных «кропках культуры» пацешылі мінскую публіку новым густоўным выданнем: першы нумар часопіса «Filet» яго стваральнікі вырашылі распаўсюджваць бясплатна, як пробную ластаўку. Часопіс, што арыентуецца на найлепшыя заходнія выданні ў галіне «канцэптуальнага глянцу», плануюць выдаваць 4 разы на год на рускай і беларускай мовах. З ладным дамешкам англіцызмаў, дадаюць першыя чытачы. Культагляднік «Нашай нівы» ЛК мяркуе, што часопіс імкнецца заняць нішу паміж «Студэнцкай думкай» і альманахам «pARTisan».

Эксперты ад мультымедыячасопіса «34» ахрысцілі новае стварэнне «бесхрыбетным»: ёсць цудоўнае мяса — візуальная частка, але касцей — цікавых і, галоўнае, арыгінальных, а не запазычаных за мяжой, тэкстаў, на якіх зазвычай трымаецца саліднае выданне, — кот наплакаў. Была прыдзірлівай да часопіса і гаспадыня кнігарні пры галерэі «Ў» Аляксандра Дынько, якая прагназуе хуткую самаліквідацыю праекта: «Filet», прынамсі калі ён будзе прытрымлівацца той сарамлівай стратэгіі, якую абраў для пілотнага нумару, пойдзе даўно пракладзеным трактарам «Беларус» шляхам усіх нашых глянцавых выданняў».

У той жа час нумар прыйшоўся даспадобы мэтавай аўдыторыі часопіса — «актыўныя, цікаўныя людзі з мінімальным узроўнем падрыхтаванасці» (так апісвае свайго сярэдняга чытача галоўны рэдактар «Filet» Валеры Краснагір). Пра гэта можна меркаваць па захопленай рэакцыі журналісткі Асі Паплаўскай, якая рэкламуе часопіс у сваім прыватным блогу.

Асабіста мне імпануе тое, што ў стартавым нумары «Filet» можна пачытаць вершы Арцёма Кавалеўскага і Вольгі Гапеевай — мала які айчынны глянец цешыць нас сучаснай літаратурай. Да таго ж, безумоўна варта паглядзець на выдатныя ілюстрацыі трох Вольгаў: Хахловай, Даніловіч і Пратасавай. Кожная іх праца — шэдэўр фотамастацтва.







Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 105
Падпісана да друку 05.02.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.